Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 СНЕЖНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 246 (30126)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ ЗЯМЛЯ І ЯЕ ВЯСКОВЫЯ БРЭНДЫ

МС

ЯКІЯ БЕЛАРУСКІЯ ВАКЦЫНЫ ХУТКА З'ЯВЯЦЦА

13

КАРАТКА

• Сёння дзень супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі. З прафесійным святам іх павіншаваў Прэзідэнт Беларусі.

• Каля 10 тон дабрачыннай дапамогі сабралі жанчыны Брэсцкай вобласці для дзяцей Данбаса.

• Мінскае АСВОД: з-за інтэнсіўнага раставання выхад на лёд строга забаронены.

• Колькасць тых, хто аздаравіўся ў санаторыях Беларусі, сёлета перавысіць 1,5 млн чалавек.

• Вайлупай прадоўжыў кантракт з венгерскім «Веспрэмам» яшчэ на два гады.

• ДПК: чарга фур перад польскім пагранпераходам за суткі павялічылася на 200 адзінак.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль МАРКЕВІЧ, міністр культуры:

«Акцыя «Нашы дзеці» дазваляе дакрануцца да сапраўдных каштоўнасцяў: дабрыні, любові, павагі адзін да аднаго. Ужо больш за 25 гадоў акцыя крочыць па нашай беларускай зямлі, і мы гэтым, праўда, даражым. Кожны раз з дзецьмі мы адчуваем новыя эмоцыі. Гэта выдатна, таму што мы разумеем: якія каштоўнасці сёння ўкладзём у наша падрастаючае пакаленне, такі клопат у адносінах да сябе будзем адчуваць заўтра. Я перакананы, што такая ўзаемная ўвага дазваляе нам упэўнена глядзець у будучыню».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СІТУАЦЫЯ Ў МЕЛІЯРАЦЫІ ДАЛЁКАЯ АД ІДЭАЛЬНАЙ»

Прэзідэнт раскрытыкаваў урад за недахопы ў вырашэнні аднаго з найважнейшых дзяржаўных пытанняў

«Меліярацыя — тэма для Беларусі не новая, але найважнейшая для сельскай гаспадаркі», — адзначаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка год таму на пленарным пасяджэнні рэспубліканскага семінара-нарады па аднаўленні і выкарыстанні меліяраваных зямель у Талачынскім раёне. Да гэтага пытання вярнуліся і на адпаведнай нарадзе, якая ў аўторак прайшла ў Палацы Незалежнасці з удзелам кіраўнікоў дзяржаўных органаў і старшыняў аблвыканкамаў. На парадак дня таксама было вынесена і пытанне развіцця ЗАТ «Беларуская Нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя». Гэтыя пытанні Аляксандр Лукашэнка назваў найважнейшымі.

Гэта вельмі важны для краіны праект

«Ужо год, як адбылося ўрачыстае адкрыццё ўнікальнай маштабнай вытворчасці БНБК. Мы ганарымся гэтай вытворчасцю. Для старту яе работы былі створаны ўсе ўмовы. І мы дамовіліся, што будзем усяляк падтрымліваць праект. Аднак па прадстаўленых дакументах бачу, што справы ідуць не зусім так, як планавалі», — адзначыў Прэзідэнт. Камітэт дзяржаўнага кантролю, якому было даручана самым сур'ёзным чынам прарэвізаваць работу БНБК, дакладвае: ёсць істотныя недапрацоўкі і праблемы па загрузцы магутнасцяў завода, збыце гатовай прадукцыі. «Усё гэта негатыўна ўплывае на фінансавыя паказчыкі БНБК. Хацелася б пачуць ад урада выразны алгарытм ухілення ўсіх наяўных недапрацовак у рабоце прадпрыемства. Перш за ўсё — як рэалізоўваюцца вытворчыя планы і экспартная стратэгія? Ці патрабуюцца дадатковыя рашэнні для збалансаванага развіцця карпарацыі?» — акрэсліў асноўныя пытанні па гэтай тэме беларускі лідар.

Фота БелТА.

СТАР. 2

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Перадсвяточнае

АД ШЫШКІ ДА ЯЛІНКІ

Шлях навагодняй прыгажуні прасачылі ад самага пачатку

Чароўны дух Каляд і Новага года паступова ахоплівае ўсё навокал. Казачная ілюмінацыя, тэматычныя ўпрыгожанні кафэ і магазінаў, вясёлыя гулянні на вуліцах гарадоў і, вядома ж, пах мандарынаў і яловых галінак. Здаецца, свята і не свята зусім без лясной прыгажуні. А ці задумваліся вы калі-небудзь, які доўгі шлях робіць навагодняе дрэва перш, чым апынуцца ў вашай хаце? Спецыяльна для таго, каб паказаць вам гэты працэс з самага пачатку, «Звязда» адправілася ў Валожынскі лясгас.

СТАР. 5

Здраўніца

НА НОВЫ ГОД І АДПАЧЫЦЬ, І ПАЛЯЧЫЦЦА

Колькі каштуе свята ў санаторыі?

Сустрэча Новага года ў беларускім санаторыі абыдзецца ў сярэднім у 115 рублёў за пражыванне (за суткі ў стандартным двухмесным нумары) і 225 рублёў за святочны банкет. Пры гэтым вольных месцаў у беларускіх здраўніцах на навагодні перыяд не засталося.

Ажыятажны попыт

Як адзначае **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ,** беларускія санаторыі карыстаюцца ажыятажным попытам на сёлетні Новы год. Браніраванне пачалося задоўга, і здраўніцы будуць запоўнены цалкам. Навагодняя заезды пачынаюцца з 24 снежня і будуць доўжыцца да 10 студзеня.

У святочны перыяд адпачывальнікам прапануюць увесь спектр паслуг па пражыванні, харчаванні, адпачынку і лячэнні.

— Будзе наладжаны бесперапынны лячэбны працэс, бо 93 % пуцёвак прададзена з курсам лячэння, — адзначае Генадзь Балбатоўскі.

Акрамя таго, усім ахвотным будуць традыцыйна прапанаваны забаўляльныя і экскурсійныя праграмы па ўсіх выдатных мясцінах Беларусі.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«СІТУАЦЫЯ Ў МЕЛІЯРАЦЫІ ДАЛЁКАЯ АД ІДЭАЛЬНАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Я хачу, каб вы разумелі. Гэта іміджавы праект, вельмі важны тэхналагічны праект для нашай краіны», — дадаў ён.

Меліярацыю трэба праводзіць па навуцы

Наступнае надзённае пытанне — меліярацыя. Яго абмеркаванне атрымалася жорсткім і прынцыповым. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што год таму прайшоў маштабны рэспубліканскі семінар-нараду, дзе вызначылі цалкам зразумелыя задачы. На семінары дамовіліся аб неабходнасці з 2023 да 2025 года аб'ёмы меліярацыйных мерапрыемстваў патроіць у адносінах да паказчыка 2021 года. «Як мне дакладвае профільны віцэ-прэм'ер Леанід Канстанцінавіч Заяц, патроілі ў гэтым годзе. Патроілі?» — запытаў кіраўнік дзяржавы. Леанід Заяц гэта пацвердзіў.

«Але што мяне здзіўляе, выходзячы з вашых пісанняў: усё паламана — з сотні траншэекапальнікаў толькі адзін працуе і іншае, іншае... Ратаваць трэба меліярацыю як галіну. Дык як жа вы павялічылі за гэты год? Вы што, рыдлёўкамі капалі траншэі? Ці вы хочаце жаданае выдаць за сапраўднае? Не атрымаецца», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў, што ў 2023 годзе губернатары абавязаліся ўвесці ў сельскагаспадарчае абарачэнне 110 тысяч гектараў меліярацыйных земляў. Рашэнні на ўзроўні Прэзідэнта па фінансаванні меліярацыйных работ і закупцы тэхнікі прыняты яшчэ ў сярэдзіне года. «То-бок мы трыма пальцамі сабралі з усіх сфер і галін грашовыя рэсурсы і прадставілі іх для меліярацыі. Аднак, як мне дакладваюць, у асобных абласцях сітуацыя з выкананнем далёкая ад ідэальнай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Для выпраўлення сітуацыі ўрад з аблвыканкамамі ініцыруе змяненне структуры работ з канцэнтрацыяй рэсурсаў на культуртэхнічнай меліярацыі. Аднак, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, культуртэхніка і меліярацыя — розныя рэчы. «Культуртэхніка — гэта там, дзе мы «загадзілі» сельскагаспадарчыя ўгоддзі і там пачаў расці хмызняк — яго трэба высякаць, прывадзіць сельскагаспадарчыя ўгоддзі ў нармальны выгляд. Вось яна, культуртэхніка. А меліярацыя — гэта ўжо больш сур'ёзная рэч. Гэта там, дзе трэба капаць, дзе трэба каналы пракладваць ці аднаўляць. Дзе трэба пракладваць дрэнаж, каб з палёў прыбраць залішнюю вільгаць. Гэта ўжо больш сур'ёзная рэч, — растлумачыў Прэзідэнт. — Не атрымалася капаць і пракладваць дрэны, ратаваць сельскагаспадарчыя ўгоддзі сур'ёзным чынам — вы мне падкідваеце ініцыятыву ўсё гэта перавесці ў культуртэхнічныя работы. А заўтра вы прапануеце за грошы, якія пушчаныя на меліярацыю (больш сур'ёзныя грошы), перакінуць на высяканне хмызнякоў. Дык вось маё рашэнне, Раман Аляксандравіч (прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. — **«Зв.»**), хмызнякі будзеце высякаць сякерай і рыдлёўкамі». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што культуртэхнічныя работы павінны праводзіць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы,

Фота БелТА.

а меліярацыю трэба праводзіць па навуцы.

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што яго ўражваюць стаўленне службовых асоб да такога важнага пытання, як меліярацыя. «Мной імем рэвалюцыі прынята рашэнне аб фінансаванні гэтых работ. Я вас папярэджваў, што мы адрываем, як я часта кажу, ад лекаў і іншага для таго, каб выратаваць землі сельскагаспадарчага прызначэння. Чаму? Таму што восем мільярдаў долараў экспарт па сельгаспрадукцыі. Чаго нам не хапае? Зямлі, зямельных рэсурсаў. Дык у нас жа прастойвае паўмільёна гектараў, як мінімум, болей нават — тое, што мы намецілі па меліярацыі. Трэба выратаваць тое, што сёння трэба і можна выратаваць», — заявіў ён. Пры гэтым, як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, ёсць выпадкі жудаснага стаўлення да тых зямель, дзе правялі меліярацыю. У гэтыя землі ўкладзены вялізныя сродкі, але вада як стаяла, так і стаіць, і патрэбных вынікаў на гэтай тэрыторыі няма.

«А я вас папярэджваў: як у савецкія часы, падрыхтавалі плошчы — перадайце кіраўніку сельскагаспадарчага прадпрыемства. І няхай кіраўнікі райвыканкамаў, аблвыканкамаў нясуць за гэта адказнасць», — сказаў беларускі лідар.

Падыходзіць трэба па-гаспадарску

Асобна Прэзідэнт звярнуў увагу, што больш чым на 10 тысячах гектараў (у Гродзенскай вобласці — 2,2 тысячы, Віцебскай і Магілёўскай — па 4,3 тысячы) прапаноўваецца правесці не рэканструкцыю меліярацыйных сістэм, а работы па ліквідацыі кустоў, ачыстцы каналаў, раскарчоўцы і іншыя. «Ну дык карчуйце — якія вам грошы? Утрымліваць меліярацыйныя каналы ў чысціні і парадку, своечасова абслугоўваць, каб кожны кавалак зямлі быў у севазвароце, — святы абавязак уласніка (прадпрыемстваў меліярацыйных сістэм і сельгасарганізацый). На якой прычыне гэта не зроблена? І мне не трэба канстатацыя фактаў», — сказаў ён. Савет Міністраў спасылаецца на высокую ступень зносу траншэекапальнікаў. На гэта Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз іранічна заўважыў, што не разумее, як пры дрэнным стане тэхнікі ўдалося ўтрая павялічыць аб'ёмы меліярацыйных работ. «Гэта значыць, Леанід Канстанцінавіч (віцэ-прэм'ер Леанід Заяц. — **«Зв.»**), вы хлусіце па выкананні аб'ёмаў ці ў вас траншэекапальнікі не на ладан дыхаюць. Мне няважна, хлусіце вы, ці старшыні райвыканкамаў, ці вашы меліяратары, — заявіў Прэзідэнт.

Таксама адной з праблем, якая перашкаджае эфектыўнаму правядзенню меліярацыі, называецца адсутнасць праектнай дакументацыі на ўсю плошчу меліярацыйных сістэм. «Што ж гэта за праблема — узяць старую дакументацыю? Я ж вас не штурхаю новыя меліярацыйныя сістэмы асвойваць, а тыя, што былі асвоены ў савецкія часы. Іх трэба аднавіць. Усё. Не трэба больш лезці ў лясы і балоты. Аднавіце гэтых паўмільёна гектараў і інакш будзем весці размову», — сказаў Прэзідэнт.

Камбайн і трактар павінны працаваць не менш чым 15 гадоў

Па звестках урада, у краіне ёсць 101 траншэекапальнік, з якіх 99 поўнасцю зношаныя. «Скажы шчыра: ты падпісаў тое, што табе падсунулі, ці сам палічыў?» — удакладніў Прэзідэнт у прэм'ер-міністра. «Кожны, вядома, не правяралі», — адказаў Раман Галоўчанка. «Дык не падпісвай тое, што не правяраў. Пакліч іх і скажы, як можна з сотняй, якія няспраўныя, у тры разы павялічыць аб'ёмы. Гэта ж на паверхні», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што была дасягнута дамоўленасць няспраўную тэхніку адпраўляць у цэнтры аднаўлення і там яе рамантаваць. Вельмі важна, што адноўленая ў такіх цэнтрах тэхніка каштуе ў два, а некаторыя адзінкі і ў тры разы менш, чым новыя. «У нас тэхніка адпрацавала восем гадоў і амартызавалася. Я вас папярэджваў наконт амартызацыі: нічога не павінна амартызавацца. Усё павінна быць адноўлена і працаваць. Камбайн, трактар энерганасычаны павінны працаваць не менш за 15 гадоў. Вось вам уся амартызацыя. Я сам гэта ўсё прайшоў, я ведаю, што гэта такое», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што недапушчальна за некалькі гадоў гробіць тэхніку, кідаць яе пад плот і закупляць новую.

Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў, што год таму даручыў правесці інвентарызацыю меліярацыйнай тэхнікі і прыняць усе неабходныя меры па яе аднаўленні, рамонце і захаванасці. Ён спытаў, калі будзе вынік.

«Калі з красавіка не пачнуць працаваць усе траншэекапальнікі, якія там павінны быць на ўліку, — усіх пасадзяць. Публічна вас папярэджваю», — паставіў задачу Прэзідэнт кіраўніцтву Камітэта дзяржаўнага кантролю. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што лягчэй і выгадней адрамантаваць гэтую тэхніку, чым вырабіць новую. Але дзе трэба, варта і вырабіць паўтара дзясятка траншэекапальнікаў.

Прэзідэнт нагадаў, што ў студзені 2023 года яму дакладвалі, што на падставе заявак меліярацыйных арганізацый распрацавалі і зацвердзілі план вытворчасці спецыялізаванай тэхнікі кампаніі «Амкадор» і стварэння сэрвісных цэнтраў па яе гарантыйным абслугоўванні. «Дзе гэта? — спытаў ён. — Вы ж прыходзілі і плакалі за «Амкадор», што дапамагчы трэба. Грошы выдзелілі. Мы куды грошы выдзяляем?». Як далажыў намеснік прэм'ер-міністра Пётр Пархомчык, сёлета засталося паставіць 6 траншэекапальнікаў. Да новага года яны ўсе будуць перададзены ў гаспадаркі, запэўніў ён. Але Прэзідэнт прывёў іншыя лічбы: з запланаваных да пастаўкі на 2023 год 188 адзінак амкадораўскай тэхнікі на 12 снежня пастаўлена ўсяго 64. А шматкаўшовых траншэекапальнікаў таго ж плана — толькі адзін (!) з 14.

Аляксандр Лукашэнка запытаў, наколькі абгрунтаваны падыходы да змянення структуры меліярацыйных работ у кантэксце дзяржаўнай задачы па маштабнай рэканструкцыі меліярацыйных сістэм да 2025 года. Гэта пытанне ён назваў галоўным.

Каму патрэбна паказуха?

Прэзідэнт расказаў, што бачыць сітуацыю з меліярацыяй, пралятаючы над краінай на верталёце. Напрыклад, у Мінскай вобласці ёсць землі, якія патрабуюць выратавання, але гэтым не займаюцца. А ў Шклоўскім раёне, на малой радзіме Прэзідэнта, усё прыведзена ў парадак. «Мяне забівае тое, што вы паказухай займаецеся. Я ж па ўсёй краіне лятаю, я ж бачу, дзе вы працуеце, дзе — не. І адсюль нарадзілася гэтая меліярацыя. Адсюль я разумею, што гэтыя землі трэба выратаваць. Нам трэба гэта выратаваць і зрабіць задзел для нашых дзяцей, каб яны разумелі, як працаваць», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт спытаў, якія ўражанні ад меліярацыі ў прэм'ер-міністра. Адказваючы на гэта пытанне, Раман Галоўчанка пачаў з таго, што апошнія дзесяць гадоў гэтаму пытанню не ўдзялялася належнай увагі. Гэта прывяло да дэфрагментацыі сістэмы кіравання меліярацыяй. «Адпаведнае падраздзяленне, якое працавала ў Мінсельгасхарчы і займалася вертыкаллю меліярацыяй, было расфарміравана некаторую колькасць гадоў таму. Абласныя меліярацыйныя арганізацыі былі фактычна ў свабодным плаванні», — сказаў ён. Раман Галоўчанка адзначыў, што ў пачатку мінулага года па даручэнні Прэзідэнта ўрад заняўся рэанімацыяй гэтай сістэмы. «Першае, з чым сутыкнуліся, — умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый. Карціна была абсалютна стракатая, недзе было ўсё развалена: тэхніка пад плотам, не было аб'ёмаў работ, людзі разбегліся. Трэба было ўсё гэта пералічыць, прааналізаваць кожную машыну», — расказаў кіраўнік урада. Прэзідэнт спытаў, хто панёс адказнасць за неахайнае стаўленне да тэхнікі. Раман Галоўчанка далажыў, што 100 чалавек прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, заведзена 13 крымінальных спраў і 10 чалавек звольнены па дыскрэдытавальных абставінах.

«Вы пакаралі, звольнілі, а яны ўжо ў прыватных структурах сядзяць і з вас пасмейваюцца. Немагчыма такое? Магчыма. Вось у гэтым стыль вашай працы. Мы тут рашэнне прынялі. А там што?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пацікавіўся пазіцыяй Камітэта дзяржаўнага кантролю. Старшыня КДК далажыў, што асноўнай праблемай застаюцца прыпіскі, прычым гэта характэрна для кожнай вобласці. «Самае страшнае — гэта тое, пра што вы гаварылі і па чым былі ўзбуджаны крымінальныя справы: калі была зроблена меліярацыя, але ўсё зарасло па новай. Гэта значыць, мы грошы проста закапалі. У гэтым выпадку і намі, і пракуратурай прымаюцца самыя жорсткія меры», — сказаў старшыня КДК Васіль Герасімаў.

Прэзідэнт даручыў Камітэту дзяржаўнага кантролю бесперапынна кантраляваць ход работ па меліярацыі і дакладваць яму. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што меліярацыя — зона адказнасці не толькі ўрада, а перш за ўсё губернатараў.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

У краіне ёсць усё, каб падтрымліваць гэтыя землі ў парадку

Віцэ-прэм'ер Леанід ЗАЯЦ расказаў журналістам, што падчас нарады Прэзідэнт раскрытыкаваў землекарыстальнікаў, якія неэфектыўна выкарыстоўваюць землі, перададзеныя для меліярацыі. Дзесьці не засяваюцца своечасова, дзесьці зарастаюць хмызняком. «Кожны, хто атрымаў такія землі, дзе патрачаны сродкі дзяржавы, — павінен засяваць гэтыя палі і атрымліваць ураджай не горшы, чым з усіх астатніх плошчаў. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы, уся меліярацыйная тэхніка, якая лічыцца сёння на балансе меліярацыйных арганізацый, павінна быць адрамантавана да красавіка. У краіне створаны спецыяльныя меліярацыйныя прадпрыемствы, якія абавязаны сёння выконваць тэхнічнае абслугоўванне гэтых зямель: падчышчаць каналы, высякаць кусты, сачыць за тым, каб не забалочваліся гэтыя землі. Наша краіна валодае ўсім неабходным: і арганізацыямі, і тэхнічнымі магчымасцямі, і кадравым патэнцыялам — для таго, каб трымаць у парадку гэту тэрыторыю», — расказаў намеснік прэм'ер-міністра.

Другім пытаннем нарады стала развіццё БНБК. «Прэзідэнт заслухаў даклады службовых асоб, кіраўнікоў БНБК і яшчэ раз нагадаў аб тым, што гэта вельмі патрэбнае прадпрыемства для Беларусі, яно значнае і павінна вырашаць праблемы ў жывёлагадоўлі», — сказаў Леанід Заяц. Па яго словах, было вырашана «ўмацаваць кіраўніцтва» БНБК прадстаўніком дзяржавы, на яго ўскладуць функцыю кантролю за работай прадпрыемства. Іншымі словамі, прадстаўнік дзяржавы будзе адказваць за стратэгію, а непасрэдны кіраўнік карпарацыі — за тактыку.

Гуманітарны складнік

ВЫЙСЦІ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ПАЗНАННЯ

Як развіваецца супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ў кнігавыдавецкай галіне

Беларусь і Кітай шмат гадоў наладжваюць кантакты ў розных сферах. У прыватнасці, што датычыцца гуманітарнага супрацоўніцтва, яно актыўна ажыццяўляецца паміж нашымі краінамі і мае свае станоўчыя вынікі. Рэалізоўваюцца сумесныя праекты, напрацоўваюцца і ўсталёўваюцца новыя сувязі для далейшага развіцця ў дадзеным кірунку. У аўторак адбылася сустрэча міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь з начальнікам Упраўлення Кітайскай Народнай Рэспублікі па справах выдавецтва і распаўсюджвання літаратуры на замежных мовах, дзе абмеркавалі прапановы двухбаковага супрацоўніцтва на найбліжэйшую перспектыву.



Падчас сустрэчы бакі абмяняліся падарункамі.

— Паважаныя калегі, мы ўдзячныя, што вы змаглі знайсці час і магчымасць арганізаваць нашу сённяшнюю сустрэчу напярэдадні важнай падзеі — прэзентацыі кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні». Асаблівы гонар выклікае тое, што гэтае мерапрыемства стала магчымым дзякуючы шчыльнаму супрацоўніцтву выдавецтва «Мастацкая літаратура» і кітайскага Выдавецтва літаратуры на замежных мовах, — звярнуўся да прысутных **міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ.** — Мы лічым, што менавіта такое канструктыўнае супрацоўніцтва паміж выдавецтвамі Кітайскай Народнай Рэспублікі і Рэспублікі Беларусь можа здзяйсняцца і будзе наладжана пасля падпісання адпаведнага пагаднення. Наша ўзаемадзеянне магчымае па прынцыпу агульных прынцыпаў, агульных поглядаў на знешні і ўнутраны свет, палітыку, якія падзяляюць нашы народы. І сёння я прапаную абмеркаваць канкрэтныя крокі па сумеснай далейшай рабоце дзвюх нашых сфер — выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці — па прасоўванні літаратуры кітайскіх аўтараў і літаратуры беларускіх аўтараў на нашых кніжных рынках.

Начальнік Упраўлення КНР па справах выдавецтва і распаўсюджвання літаратуры на замежных мовах Ду ЧЖАНЬЮАНЬ таксама пагадзіўся, што супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі павінна пашырацца. І добры прыклад таму — якраз выхад кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» ў перакладзе на беларускую мову, якая будзе прэзентавана ў хуткім часе.

— На сёння гэтая кніга выдадзена ў чатырох тамах і даступная на 38 мовах у

180 краінах свету. А цяпер можна з радасцю казаць пра тое, што дзякуючы нашым сумесным намаганням, супрацоўніцтву з выдавецтвам «Мастацкая літаратура» першы том кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» будзе даступны для чытача і на беларускай мове, — зазначыў ён.

Увогуле, трэба адзначыць, што нашы краіны маюць працяглы шлях і гісторыю па супрацоўніцтве ў галіне кнігавыдання. Да прыкладу, у 2015 годзе Кітайская Народная Рэспубліка была краінай — ганаровым госцем на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы. Пісьменнікі з Кітая прымалі ўдзел у Міжнародным сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час», які ў той год Міністэрства інфармацыі і Саюз пісьменнікаў Беларусі правялі ўпершыню. Напярэдадні гэтых сустрэч Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі выдаў серыю паэтычных зборнікаў «Светлыя знакі: паэты Кітая». Першая кніга з 13 прадстаўленых у серыі — зборнік паэзіі Ван Вэя ў перакладзе на беларускую мову — убачыла свет у снежні 2014 года.

— У 2012 годзе ў Мінску была выдадзена анталогія «Пад крыламі Дракона: Сто паэтаў Кітая» ў перакладах лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколы Мятліцкага. Пазней Міністэрства інфармацыі падтрымала выпуск анталогіі «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы: Сто паэтаў Кітая XX стагоддзя» і вялікую кнігу класіка кітайскай паэзіі XX стагоддзя Ай Ціна «Гімн святла», перакладчыкам якіх таксама выступіў Мікола Мятліцкі. Выданні кітайскай паэзіі на беларускай мове былі адзначаны дыпломамі на конкурсе краін СНД «Мастацтва кнігі СНД», — распавёў **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.** — Літаральна напярэдадні бягучага навучальнага года Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы Пасольства КНР у Беларусі правёў акцыю па ўручэнні кніг пра Кітай і беларуска-кітайскае супрацоўніцтва школам і ВНУ Беларусі, дзе вывучаецца кітайская мова... А зусім нядаўна ў Кітаі ўбачыла свет анталогія твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на кітайскую мову. Рыхтуецца да выхаду кніга прозы і паэзіі пісьменніка Алеся Бадака. Ідзе праца над шэрагам іншых кніжных праектаў, якія садзейнічаюць развіццю беларуска-кітайскіх кнігавыдавецкіх і літаратурных адносін. Напрыклад, разглядаецца пытанне выдання асобнай кнігай класічнага твора «Дзікае паляванне караля Стаха», якое публікавалася ў часопісе «Беларусь» на кітайскай мове.

Што да вынікаў сустрэчы, то папярэдне два бакі агучылі жаданне стварэння экспазіцыі сучаснай кітайскай літаратуры ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, далей працаваць над выданнем кніг рознай тэматыкі на дзвюх мовах. Таксама міністр інфармацыі агучыў запрашэнне бачыць Кітайскую Народную Рэспубліку краінай — ганаровым госцем на XXXI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

— Мы маем добрае супрацоўніцтва на цяперашнім этапе адносін паміж нашымі лідарамі, дзяржавамі і нашымі народамі. Выдаецца вялікі спектр кніг ад «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні» да перакладаў мастацкай літаратуры. Але гэтага сёння недастаткова, бо ёсць вялікі інтарэс у нашых людзей да Кітая, да яго бізнесу, культуры. Таму нам патрэбны кнігі, якія дапамогуць чытачам знайсці тое, што задаволіць іх інтарэс, дазволіць зразумець гісторыю гэтай вялікай краіны, — адзначыў Уладзімір Пярцоў. — Мы дамовіліся абнавіць пагадненне аб супрацоўніцтве, што дазволіць нам рэалізаваць усе агучаныя планы. Каб у людзей была магчымасць прыйсці ў бібліятэку, кніжную краму і атрымаць доступ да патрэбных ім кніг, разумець, асабліва ў эпоху лічбавай постпраўды, што ўяўляюць сабой кітайскі і беларускі народы.

Алена ДРАПКО.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

НА НОВЫ ГОД І АДПАЧЫЦЬ, І ПАЛЯЧЫЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мяркуецца, што ў святочныя даты ў беларускіх здраўніцах адпачне 24 тысячы чалавек, сярод іх каля 45 % (11—12 тысяч) замежнікаў. Пераважная іх большасць (95 %) — расіяне.

— Па выніках мінулага года грамадзяне Расіі складалі 95 % замежнікаў, якія адпачывалі ў нашых санаторыях. Пры гэтым геаграфія наведвальнікаў перавысіла 60 краін. Ва ўмовах пэўнай рыторыкі заходніх краін значнага прытоку гасцей з гэтых краін чакаць не даводзіцца. Аднак штодзень у нашых здраўніцах адпачывае не менш за 100 гасцей з краін Балтыі. На Новы год іх будзе некалькі соцень, — прывёў лічбы Генадзь Балбатоўскі.

Як вядома, беларусы могуць адпачыць у айчынных санаторыях і за межамі Беларусі. Найперш гэта здраўніцы ў Туапсэ, Сочы і Міскоры. На працягу года яны стабільна карысталіся попытам,

на Новы год таксама запоўнены амаль на 100 %.

Беларускі санаторый у літоўскім Друскінінкаі працуе ў штатным рэжыме. Сёлета ў ім па льготных пуцёўках адпачыла больш за 840 беларусаў — як дзяцей, так і дарослых. Праўда, толькі тыя, хто меў візы. Новых урад Літвы не выдае нават дзецям-інвалідам.

93 рублі за суткі

У цэлым сістэма санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення сёлета спрацавала паспяхова. Менавіта 2023 год прэтэндуе на некалькі рэкордаў. У прыватнасці, па колькасці адпачывальнікаў. За год лячэнне і аздараўленне ў санаторыях прайшло 1,5 мільёна чалавек.

Выручка ад паслуг у параўнанні з мінулым годам па папярэдніх падліках вырасла на 25—30 %. За год яна складзе каля 1,5 мільярда рублёў. Колькасць замежных грамадзян вырасла за гэты год на 15—20 %, экспарт паслуг павялічыўся на 25—30 % і ў лічбах складае каля 300 мільёнаў рублёў.

Рэкордныя стануць і ўкладанні саміх здраўніц у развіццё лячэбнай і матэрыяльна-тэхнічнай базы. За дзевяць месяцаў гэта лічба ўжо перавысіла 109 мільёнаў рублёў, што ў два разы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Дарэчы, летась за год гэтыя выдаткі склалі 98 мільёнаў.

Цэны на пражыванне за год павялічыліся ў межах 5-7 %. Калі летась сярэдняя цана на месца ў двухмесным стандартным нумары складала 86 рублёў за суткі, то сёлета — 93 рублі. Дарэчы, зімой цэны крыху ніжэйшыя (у сярэднім 98 рублёў), чым летам (каля 100 рублёў). Цана навагодняга бангкета сёлета — каля 225 рублёў, летась за яго плацілі ў сярэднім 200.

Найбольшы попыт на лагеры — у сталіцы

Каля 66 тысяч школьнікаў пройдуць аздараўленне падчас зімовых канікул — з 24 снежня да 7 студзеня. У гэты час будуць працаваць як дзённыя школьныя, так і кругласутачныя лагеры. Рэжым работы дзённых лагераў — не менш за шэсць дзён, кругласутачных — не менш за дзевяць дзён.

На фінансаванне іх работы з рэспубліканскага бюджэту выдаткавана каля двух мільёнаў рублёў. Найбольшы попыт — у сталіцы. Каля 12 тысяч юных мінчан выказалі пажаданні прайсці аздараўленне. Амаль столькі ж ахвотных у Віцебскай і Мінскай абласцях — каля 10 тысяч дзяцей у кожным з рэгіёнаў. Як паабяцаў Генадзь Балбатоўскі, заяўкі ўсіх ахвотных будуць задаволены.

Алена КРАВЕЦ.

Энергетыка

ВІРТУАЛЬНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ Ў РЭАЛЬНЫМ ВЫКАНАННІ

Лічбавыя прадукты і супрацоўніцтва Дзяржкарпарацыі «Расатам» і Беларусі

На пачатку гэтага года на Беларускай АЭС адбылася чарговая мадэрнізацыя трэнажораў, якія з'яўляюцца дакладнай рэплікай рабочага месца аператара і дапамагаюць спецыялістам практыкавацца ў кіраванні станцыяй і павышаць сваю кваліфікацыю. У партнёрстве з кампаніяй «Белэнергарамналадка» (пад патранажам «Белэнерга») прадстаўнікі Дзяржкарпарацыі «Расатам» плануюць цягам пяцігодкі забяспечыць 11 станцый высокага ціску спецыяльнымі трэнажорамі, якія стануць сумесным расійска-беларускім прадуктам. Дзякуючы іншым лічбавым распрацоўкам, якія ствараюцца кампаніямі «Расатама», у тым ліку і ў партнёрстве з Беларуссю, адбываецца лічбавая трансфармацыя і ўдасканаленне многіх галін гаспадаркі абедзвюх краін, а на далейшае развіццё партнёрства ў бакоў вялікія планы. Падпісаны шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве, у рамках якіх вядзецца работа. Пра некаторыя лічбавыя рашэнні, якія да таго ж з'яўляюцца і імпартазамяшчальнымі, а таксама супрацоўніцтва з нашай краінай расказалі спецыялісты расійскіх кампаній.



Трэнажоры і тач-панэлі

Трэнажоры выкарыстоўваюцца ў атамнай, цеплавой энергетыцы, у непарыўнай вытворчасці для нафта-газавай галіны і шмат якіх іншых. Трэнажоры для падрыхтоўкі персаналу на атамнай станцыі патрэбны, напрыклад, каб аператар не толькі ўмеў дбайна працаваць, але і ведаў, што рабіць у аварыйнай сітуацыі. Яго нельга дапускаць да кіравання станцыяй, пакуль ён не набудзе адпаведную кваліфікацыю.

Кампанія «ДЖЭТ ЛАБ» стварае дакладныя рэплікі рабочага месца аператара практычна для ўсіх станцый, якія будуюцца ў свеце. Нягледзячы на ўніверсальныя методыкі ўстройства прылады, кожны трэнажор унікальны і робіцца пад канкрэтную АЭС, прычым, як правіла, года за паўтара да запуску станцыі. Падрыхтоўку на трэнажорах праходзіць уся змена работнікаў электрастанцыі. Трэнажоры 3D-візуалізацыі, на якіх можна змадэляваць любую сітуацыю і чалавек будзе адчуваць, што ён у сапраўдных умовах станцыі, а не на трэнажоры, — іх работа.

Трэнажоры для Беларускай АЭС таксама рабіла кампанія, і іх ужо двойчы мадэрнізавалі. Раз на два-тры гады рабіць гэта трэба абавязкова, бо кожны аб'ект працягвае жыць і відазмяняцца, патлумачыў **Сяргей БУКРЭЕЎ, дырэктар кампаніі «ДЖЭТ ЛАБ»:**

— На АЭС пастаянна адбываюцца нейкія выпрабаванні, навуковыя даследаванні, адпрацоўваюцца новыя методыкі. Гэта цягне за сабой, магчыма, непрыкметныя, але ж змены тэхналагічных сістэм і сістэм кіравання. Каб трэнажор не «адставаў» ад гэтага, яго неабходна пастаянна абнаўляць. Падчас апошняй мадэрнізацыі шмат што змянілася ў папярэдніх алгарытмах работы трэнажора. Нязначныя змены адбыліся ў сферы органаў кіравання, то-бок аб'ём мадэрнізацыі набіраецца з мноства дробных удасканальванняў. Увогуле, з кожным заказчыкам нашых трэнажораў мы заўжды на сувязі і дапамагаем ва ўсіх момантах.

Запатрабаванымі становяцца трэнажоры для АЭС, дзе інфармацыя выводзіцца на тач-панэлі (зробленыя, як зразумела, не з жалеза), якімі зручна карыстацца. На іх таксама можна мадэляваць любое абсталяванне і прасцей працаваць з рознымі сістэмамі розных аб'ектаў.

— Калі ў вас мяняецца нейкая прылада, то яе прасцей «адмаляваць» віртуальна на трэнажоры, чым замяняць фізічна. Усе панэлі і пульты можна змяшчаць якраз на тач-панэлях. Укараненне тач-панэляў як альтэрнатыўнай замены жалезных дазваляе павысіць якасць навучання, дадаць інавацыйны падыход у падрыхтоўку кадраў і сэканоміць грошы, — заўважыў спецыяліст.

Ствараюцца і аналітычныя трэнажоры для неатамнай энергетыкі. Спецыялісты паказалі адзін з іх на прыкладзе поўнафункцыянальнай матэматычнай мадэлі катлатурбіннага і электрычнага цэха для комплекснай падрыхтоўкі аператыўнага персаналу. Такое абсталяванне плануецца для ўкаранення на прадпрыемствах аб'яднання «Белэнерга» як комплексны падыход да павышэння кваліфікацыі персаналу, зніжэння верагоднасці аварый і змяншэння рызыкі памылкі персаналу.

— На ім мадэлюецца нармальны і аварыйны рэжым работы канкрэтнай станцыі ў рэжыме рэальнага часу. Пры гэтым выкарыстоўваюцца віртуальныя копіі шчытоў кіравання (усе прылады, рэгулятары, дэталі таксама віртуальныя). Прынцып распрацоўкі ўлічвае праблематыку і асаблівасці энергагалiны, бо ў стварэнні ўдзельнічаюць не толькі праграмісты і распрацоўшчыкі, але і тэхнолагі — спецыялісты з вопытам работы на энергааб'ектах. Валодаючы такім вопытам, мы можам мадэляваць практычна любое абсталяванне і любыя турбіны, а таксама розныя віды паліва: прыродны газ, мазут, дызель, цвёрдыя камунальныя адходы, біямасу, — падкрэсліў Сяргей Букрэеў. *— Прадукт будзе сумесным і з цягам часу, магчыма, рушыць і на рынкі трэціх краін.*

Лічбавыя двайнікі і школы мадэлявання

Работа лічбавых механізмаў і далейшае ўдасканаленне такіх прылад скіравана на дапамогу спецыялістам у штодзённай і складанай рабоце. З гэтай прычыны распаўсюджванне ў розных сферах набылі лічбавыя двайнікі, а таксама праграмныя комплексы, якія не толькі палягчаюць працу, але і павышаюць кваліфікацыю спецыялістаў. Гэта вельмі папулярны напрамак тэхналагічнага развіцця. Лічбавыя двайнікі маюць двухбаковую інфармацыйную сувязь з аб'ектам і могуць атрымліваць даныя з яго. Такія прылады дазваляюць выбраць аптымальны рэжым эксплуатацыі абсталявання, данастроіць яго.

У 2020-м кампанія «ДЖЭТ ЛАБ» распрацавала новы лічбавы прадукт CFE-класа — мадэльна-арыентаванае асяроддзе праектавання і матэматычнага мадэлявання REPEAT, які служыць для стварэння матэматычных мадэляў складаных аб'ектаў і працэсаў у энергетыцы, у тым ліку для стварэння лічбавых двайнікоў.

— Гэтае праграмнае забеспячэнне прызначана для інжынернага аналізу і інжынерных праекціровачных разлікаў. Яно дазваляе на сістэмным узроўні змадэліраваць паводзіны розных аб'ектаў і ўстановак і зрабіць неабходныя інжынерныя разлікі, — патлумачыў дырэктар «ДЖЭТ ЛАБ». — Гэта можа быць і электрамабіль, і аўто з класічнай энергаўстаноўкай або цеплавая ці атамная электрастанцыя. Іншымі словамі, перш чым перайсці да дэталёвых разлікаў на больш складаных праграмных комплексах, на сістэмным узроўні мы можам праверыць і ўзгадніць усе папярэднія патрабаванні, унесці змены і пасля вызначэння геаметрыі вузлоў і агрэгатаў працаваць далей. Гэта цалкам воблачны сэрвіс, які дазваляе рабіць разлікі з любога пункта свету анлайн.

Патрэба ў высакакласных спецыялістах, якія маглі б працаваць са складаным праграмным забеспячэннем, даволі складаным, выклікала стварэнне школ мадэлявання пры ВНУ, якіх цяпер у Расіі шэсць, расказалі спецыялісты.

Сёлета падчас энергетычнага форуму ў Мінску кампанія «ДЖЭТ ЛАБ» падпісала з Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам Пагадненне аб стратэгічным супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, навукі і інавацыйнай дзейнасці пры рэалізацыі сумесных праектаў.

— Летась мы аснасцілі Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк нашымі трэнажорамі (больш спрошчанымі версіямі, у якіх, аднак, прысутнічае праграмнае абсталяванне REPEAT), а каб рухацца далей і насыціць кадравы голад у нашай краіне і ў беларускіх арганізацыях, мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве з БНТУ і падрыхтоўцы спецыялістаў, — падзяліўся **Канстанцін КІРЭЕНКА, кіраўнік праекта групы па праектах «Новыя бізнесы».** *— Мы хочам наладзіць партнёрскія ўзаемасувязі і з БНТУ, і з БДУІР, а налета, магчыма, адкрыем школу мадэлявання і ў Беларусі.*

Пры стварэнні расійскіх інавацыйных прадуктаў, дарэчы, частка спецпрылад заказваецца ў беларускіх вытворцаў, у прыватнасці, яны прысутнічаюць у трэнажорах, якія працуюць на БелАЭС. Усе прапановы беларускага боку адносна праграмнага забеспячэння таксама прымаюцца да ўвагі, запэўнілі спецыялісты.

У працяг далейшага развіцця беларуска-расійскіх адносін у лічбава-энергетычнай сферы вядуцца перагаворы па сумесным стварэнні трэнажораў для традыцыйнай генерацыі (станцый класічнай энергетыкі), а таксама ўкаранення тэхналогій для інжынернага аналізу (як для адукацыйнага працэсу ў ВНУ, так і на прадпрыемствах, якія вырабляюць складаную тэхналагічную прадукцыю).

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі адбылося магутнае землетрасенне

Землетрасенне магнітудай да 6,2 бала адбылося ў Лінься-Хуэйскай аўтаномнай акрузе правінцыі Ганьсу. Эпіцэнтр знаходзіўся за 101 кіламетр на поўднёвы захад ад горада Ланьчжоў, насельніцтва якога перавышае тры мільёны чалавек. Найбольшая шкода нанесена правінцыям Ганьсу і Цынхай. Тут былі пашкоджаны аб'екты водазабеспячэння, электразабеспячэння, транспартнай інфраструктуры і сувязі. У выніку землетрасення загінулі каля 120 чалавек, сотні пацярпелі. Таксама паведамляецца аб зніклых без вестак. Старшыня КНР Сі Цзіньпін заклікаў прыкласці максімум намаганняў для пошуку і выратавання пацярпелых, аказання медыцынскай дапамогі, а таксама для эвакуацыі і размяшчэння людзей, якія страцілі прытулак. Сі Цзіньпін таксама даручыў уважліва сачыць за сейсмічнай абстаноўкай і зменамі надвор'я, каб прадухіліць другасныя негатыўныя наступствы. У раёне бедства праводзіцца пошукава-ратавальная аперацыя. Пад завалами могуць знаходзіцца тыя, хто выжыў. Дзяржсавет КНР накіраваў рабочую групу ў пацярпелыя раёны для кіраўніцтва работамі па аказанні надзвычайнай дапамогі.

«У Беларусі глыбока ўзрушаны весткай аб разбуральным землетрасенні ў правінцыі Ганьсу, якое забрала мноства чалавечых жыццяў», — гаворыцца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў Старшыні КНР Сі Цзіньпіну. Беларускі лідар таксама адрасаваў словы глыбокага спачування і падтрымкі сем'ям загінулых.

Каля 80 працэнтаў амерыканцаў лічаць, што эканоміка ЗША ў дрэнным стане

Аб гэтым сведчаць вынікі апытання, праведзенага тэлеканалам Fox News.

78 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што эканоміка знаходзіцца «ў дрэнным стане», што на дзевяць працэнтаў больш, чым у пачатку прэзідэнцкага тэрміну Джо Байдэна. Пры гэтым з агульнай колькасці апытаных 68 працэнтаў не задаволены тым, як ідуць справы ў краіне, таксама 64 працэнты заявілі, што ацэньваюць сваё фінансавае становішча як «пасрэднае або няважнае». Як зазначае тэлеканал, у канцы 2021 і 2022 гадоў гэты паказчык трымаўся на ўзроўні каля 58 працэнтаў. Акрамя таго, вялікая колькасць рэспубліканцаў (93 працэнты) і дэмакратаў (61 працэнт) ацэньваюць эканоміку адмоўна. Амаль палова ўдзельнікаў апытання (46 працэнтаў) кажуць, што палітыка адміністрацыі Белага дома нанесла ім асабістую шкоду.

Сукенка прынцэсы Дзіяны прададзена на аўкцыёне больш чым за мільён долараў

Чорная сукенка прынцэсы Дзіяны была прададзена на аўкцыёне Julien's Auctions у Галівудзе за 1,148 мільёна долараў — у 11 разоў вышэй стартавай ацэнкі.

Аксамітны вячэрні ўбор з зорным узорам стаў самым дарагім з калі-небудзь прададзеных сукенак памерлай прынцэсы Валійскай. У яго ёсць падплечнікі, спадніца з блакітнай арганзы, вялікі бант і паясок. Арганізатары аўкцыёну першапачаткова ацанілі гэтую сукенку ў 100 тысяч долараў. Упершыню Дзіяна надзела яе на вячэру ў Фларэнцыі ў 1985 годзе. Тады яна здзяйсняла каралеўскі тур разам са сваім мужам Чарльзам, прынцам Валійскім (цяпер каралём Англіі Карлам III). У 1986-м гэтую сукенку ўбачылі на публіцы яшчэ раз — Дзіяна з'явілася ў ёй падчас выступлення Ванкуверскага сімфанічнага аркестра.

АД ШЫШКІ ДА ЯЛІНКІ

Вядучы інжынер па паляўнічай гаспадарцы Валожынскага лясгаса Павел САДОЎСКІ замацоўвае камеру фотафіксацыі на дрэве.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Перад намі разгарнулася плантацыя плошчай у адзін гектар. Як аказалася, тут з 2019 года высаджана 15,5 тысячы навагодніх дрэў. А пачынаецца ўсё з маленькай шышкі.

— Яны збіраюцца лесаводамі з лістапада да сакавіка. Затым адпраўляюцца на шышкасушылку, дзе з шышак выцярэбліваецца насенне з крылаткай, — расказвае **начальнік лесагадавальніка Аляксандр РАМАНЧУК**. — Пасля гэтага яны трапляюць у Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр, дзе іх абяскрыльваюць пад дзеяннем вільгаці і паветра.

З усяго гэтага атрымліваецца насенне. Ну ўсё, цяпер яго можна пасадзіць і чакаць, пакуль вырасце вялікая і пухнатая елка? Як бы не так! Перад пасевам увесь матэрыял абавязкова апрацоўваецца ад шкоднікаў і хвароб, да таго ж, усё гэта ажыццяўляецца выключна спецыялізаванай тэхнікай.

Праз год атрымліваюцца сеянцы-аднагодкі, якія знешне нагадваюць невялікую частку яловай галінкі. На працягу ўсяго гэтага часу іх трэба старанна даглядаць: праполваць, падкормліваць, абганяць. Але да перасадкі яны яшчэ не гатовы. Трэба пачакаць яшчэ годзік, калі яны, ужо будучы сеянцамі-двухгодкамі, дасягнуць вышыні ў 12 сантыметраў. Толькі тады іх можна адпраўляць з «садка» ў «школу» (так у лесагаспадарчай галіне называюць пераход з сеянца ў саджанец).

На працягу трох гадоў у «школе» саджанцы набіраюцца сіл. І толькі па заканчэнні гэтага тэрміну адпраўляюцца на лесакультурную вытворчасць. Там іх высаджваюць у кантэйнеры ці на плантацыі навагодняй ёлкі. У цэлым увесь гэты працэс ад шышкі да паўнавартаснага дрэва займае ад 5 да 15 гадоў.

Начальнік лесагадавальніка Аляксандр РАМАНЧУК дэманструе елку-двухгодку, вырашчаную ў цяпліцы.

Наша ўважлівае вывучэнне сеянцаў, саджанцаў і дарослых елак перапыніў гук трактара. Як аказалася, гэта прывезлі навагоднія дрэвы прама з лесу. Хутка іх перагрузілі ў іншы транспарт і павезлі на ёлачны кірмаш, куды мы таксама вырашылі адправіцца.

Але, на жаль, спакой нам толькі сніўся. На выездзе з гадавальніка нас чакала рэйдавая група ў форменнай вопратцы з надпісам «Дзяржаўная лясная ахова». Прама на нашых вачах яны спынілі машыну і поўнасцю праверылі яе на наяўнасць незаконна высечанага дрэва. На шчасце, яго там не аказалася і вадзіцель хутка працягнуў свой шлях. Але так бывае не заўжды.

Ляснік Румскага доследна-вытворчага лясніцтва Міхаіл АМІЛАЎСКІ выгружае елкі для транспарціроўкі на ёлачны базар.

Па словах **начальніка аддзела аховы і абароны лесу і паляўнічай гаспадаркі Дзмітрыя ПІНЧУКА**, самыя праблемныя раёны ў гэтым плане Маладзечанскі, Барысаўскі і Салігорскі. Таму сёлета ў перадднавагодні перыяд створана больш за 40 рэйдавых груп, якія патрулююць лес і выяўляюць парушэнне ляснога прыродаахоўнага заканадаўства. Калі вы законапаслухмяны грамадзянін і купілі дрэўца на ёлачным базары або высеклі яго па лясным білеце, то перажываць не варта: дастаткова ўсяго толькі даць чэк або сам білет. А вось калі вы вырашылі не зусім законным шляхам займець навагоднее дрэва, то вас чакаюць штраф і аплата кошту дрэва ў памеры адной базавай велічыні. І не варта сёння недаацэньваць Дзяржаўную лясную ахову, бо, апроч усяго іншага, у іх арсенале ёсць яшчэ і фотафіксацыя, якая аператыўна дапамагае выяўляць парушальнікаў.

Рухаемся далей і трапляем на ёлачны кірмаш у Валожыне. Там пакупнікі зацікаўлена разглядаюць святочны асартымент. Аднак самы вялікі попыт на дрэвы тут традыцыйна непасрэдна перад каталіцкімі Калядамі і Новым годам. Па словах **галоўнага інжынера, намесніка дырэктара Валожынскага лясгаса Алега САДОЎСКАГА**, у добрыя дні толькі ў Валожыне прадаецца да 40—50 навагодніх дрэў. Усяго Валожынскім лясгасам арганізавана дзевяць пунктаў продажу. Адзін з іх хутка з'явіцца ў Мінску ў раёне гандлёвага цэнтра каля метро «Каменная Горка».

А якая ж статыстыка па краіне? **Намеснік начальніка ўпраўлення, вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі Мінлясгаса Віталь БАНДАРЭВІЧ** расказаў нам, што па ўсёй Беларусі арганізавана больш за тысячу ёлачных базараў. Паводле яго слоў, летась было прададзена каля 140 тысяч навагодніх дрэў, сёлета прагноз на попыт застаецца такім жа, таму лясгасы вядуць актыўную падрыхтоўку да свят.

Самае папулярнае навагоднее дрэва — гэта еўрапейская елка, але ўжо пачала карыстацца попытам хвоя, таксама ёсць запыт на навагоднія букеты і вянкі, — адзначыў Віталь Бандарэвіч. — Наша асноўная мэта — пашырыць асартымент для таго, каб у пакупніка быў выбар.

Таксама ён нагадаў, што ёсць альтэрнатыва паходу на лясны базар. Гаворка ідзе пра самастойную высечку навагодняга дрэва па лясным білеце:

— Грамадзяне могуць звярнуцца ў лясгас альбо ў лясніцтва. Там яны запоўняць адпаведныя дакументы і атрымаюць лясны білет, па якім могуць самі высечы елку.

Дарэчы, многія ходзяць у лес за ялінкай з дзецьмі, так што гэта цалкам можа стаць добрай сямейнай традыцыяй. А яшчэ цудоўная святочная традыцыя — наведванне ранішнікаў ад лясгасаў, якія арганізоўваюцца па ўсёй краіне.

Валожынскі лясгас не стаў выключэннем. Так, у паляўнічым комплексе «Румскія сцежкі» дзяцей з нецярпеннем чакаюць Дзед Мароз, Снягурка і іншыя казачныя персанажы. Паводле слоў **намесніка кіраўніка па ідэалагічнай рабоце Валожынскага лясгаса Таццяны КАЗЫРА**, такія мерапрыемствы дапамагаюць дзецям бліжэй пазнаёміцца з лесам, а таксама паказваюць, што лясгасы могуць займацца не толькі нарыхтоўкай і пасадкай лесу.

Па асабістых назіраннях — дзеці былі ў захапленні. Карагод вакол жывой ялінкі на свежым паветры, забаўляльная праграма, Дзед Мароз, Снягурка, смачныя пачастункі і падарункі... Што ж яшчэ трэба для добрага святочнага настрою? Магчыма, толькі «навагодняя прыгажуня», якая напоўніць дом прыемным пахам лесу і ігліцы.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Ёлачны базар.

У паляўнічым комплексе «Румскія сцежкі» дзяцей з нецярпеннем чакаюць Дзед Мароз, Снягурка і іншыя казачныя персанажы.

Трывожны сігнал

ДРЭВЫ НА ДРОВЫ...

І вінаватых няма?

У рэдакцыю «Звязды» прыйшоў чарговы зварот, звязаны з незаконнай вырубкай дрэў. Гэтым разам нам напісаў Віталь Супрановіч з Мінска. Ён паведаміў, што ў Заводскім раёне сталіцы на тэрыторыі таварыства ўласнікаў Васняцова, 34/3 ці не на дровы спілавалі здаровыя дрэвы. Цытата: «...Дазволу на гэта, згодна з адказам «Зелянбуда» Заводскага раёна, які мы атрымалі, ніхто не даваў. Аднак, Камітэт прыродных рэсурсаў, падобна, лічыць, што гэта нармальна?.. Два разы хадзілі камісіі, два разы сказалі, што аштрафуюць старшыню таварыства. Але воз і дагэтуль там... Як гэта называецца? Бюракратызм, валакіта, карупцыя?»

Давялося паразмаўляць і з іншымі жыхарамі таварыства ўласнікаў. Паводле іх слоў, на агароджанай тэрыторыі раней таксама спілоўвалі дрэвы, асобныя нават пад корань, і «мы нікуды не звярталіся, думалі, што на гэта ёсць дазвол. Але калі ўбачылі, што ў абрубкі ператварыліся ажно тры вялікія і, відавочна, здаровыя вярбы, сталі біць у званы».

Па каментарый мы звярнуліся ў **Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**. Паводле слоў **начальніка аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель Таццяны ШАМЯНКОВАЙ**, парадак выдалення аб'ектаў расліннага свету ў нашай краіне ўстаноўлены Законам «Аб раслінным свеце». «Дадзены закон распаўсюджваецца ў тым ліку і на тэрыторыю таварыства ўласнікаў, таму ўсе дзеянні землекарыстальніка на прадстаўленым яму зямельным участку ў адносінах дрэў ды кустоў павінны ажыццяўляцца строга ў адпаведнасці з ім. Беларускае заканадаўства не дазваляе зносіць дрэва таму, што камусьці так захацелася. Для гэтага павінны быць важкія падставы.

Мы сапраўды двойчы выязджалі на месца здарэння, праводзілі абследаванне спілаваных дрэў. Для аб'ектыўнай ацэнкі прыцягвалі спецыялістаў КУП «Зелянбуд Заводскага раёна г. Мінска», УП «Мінскзелянбуд». Больш за тое, для таго каб вызначыць від правядзення работ (выдаленне, абрэзка), ацаніць наяўнасць і ступень пашкоджання



Да...

дрэў, іх стан, неабходнасць і дапушчальнасць праведзеных работ, мы запрасілі кампетэнтнае меркаванне ДНУ «Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі». Спецыялісты прыехалі і дэталёва агледзелі дрэвы. Згодна з іх экспертным меркаваннем, на тэрыторыі таварыства ўласнікаў праведзена моцная амалоджвальная абрэзка трох гібрыдных вербаў. Аднак ацаніць ступень пашкоджанняў можна будзе толькі ў пачатку вегетацыйнага перыяду. Таму вясной 2024 года мы разам са спецыялістамі інстытута выедзем на месца і правядзём дадатковае абследаванне. У выпадку ўстанаўлення факта незаконнага пашкоджання

Пасля...

і (ці) знішчэння аб'ектаў расліннага свету да вінаватых асоб будуць прыняты меры ўздзеяння, прадугледжаныя заканадаўствам». Прычым, як удакладніла Таццяна Шамянкова, шкода, нанесеная навакольнаму асяроддзю, будзе лічыцца за кожны са стваловых асобна. У прыватнасці, у адной з вербаў, якая спілавана на вышыню 1,3 метра ад зямлі, налічваецца ажно шэсць ствалоў.

Паводле слоў Таццяны Шамянковай, абрэзка галін — гэта адно з асноўных мерапрыемстваў па доглядзе насаджэнняў. Але трэба разумець, што яна павінна праводзіцца ў строгай адпаведнасці з біялагічнымі асаблівасцямі росту і развіцця раслін, а таксама з улікам рэкамендацый, якія змяшчаюцца ў правілах утрымання азелянёных тэрыторый, зацверджаных пастановай Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У гэтым дакументе ёсць раздзел, прысвечаны абрэзцы, прыведзена інфармацыя аб відах, мэтах, правілах, часе і тэхніцы ажыццяўлення такіх работ. У прыватнасці, фармовачная і амалоджвальная абрэзка праводзіцца ў перыяд з кастрычніка да сярэдзіны сакавіка (да пачатку сокаруху). Калі абрэзку выканалі няправільна і нашкодзілі насаджэнню, як і пры незаконным зносе дрэў, вінаватага пакараюць. За шкоду, нанесеную расліне пры няправільным доглядзе, заканадаўствам прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. Плюс да гэтага спаганяецца і кампенсацыя шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю.

«У дадзены момант па выяўленых фактах на тэрыторыі таварыства ўласнікаў працягвае весціся разбіральніцтва. Ёсць устаноўленыя тэрміны вядзення адміністрацыйнага працэсу. Гэта не робіцца за адзін дзень, — падкрэсліла суразмоўніца. — А тэрміны па разглядзе зваротаў дастаткова сціслыя. Таму пакуль мы далі заяўнікам толькі папярэдні адказ...»

Таццяна Шамянкова адзначыла, што людзі могуць не хвалявацца, па выніках дадзенага разбіральніцтва вінаватыя асобы будуць прыцягнуты да адказнасці, якая прадугледжана законам.

Чалавек — чалавеку

А святы ўжо не за гарамі

Хутка Новы год,
Каляды.
Сёлета яны зноў,
відаць,
будуць без снегу.
А так хацелася б...
І былі ж надзеі!

Помніце, у першы дзень зімы, нібы па заказе, у паветры закружылі сняжынкі, потым узняўся вецер, пачалася мяцеліца. Снег ішоў амаль двое сутак, як некалі ў маім дзяцінстве ды ў маладосці, калі працавала паштальёнам.

Зіма ці лета, дождж ці снег — гэта не павінна было адбівацца на дастаўцы газет і часопісаў, пісьмаў і паштовак. Яны тады не змяшчаліся ў адной сумцы. Другую, а то і трэцюю, даводзілася браць, калі наступалі святы, бо ў людзей за правіла было напісаць лісты ўсім родным і блізкім, на рыгожых паштоўках даслаць свае прызнанні ў любові, пажаданні здароўя і добрага настрою... Гэта я кажу не толькі пра іншых: мы самі, разам з дзецьмі, адпраўлялі да трыццаці адкрытак. Столькі ж, а то і болей, у вялікія святы маглі атрымаць.

Я чаму пра гэта пішу? Днямі па тэлевізары паказвалі, колькі рознай прыгажосці падрыхтавала наша пошта да свят: і паштоўкі там, і канверты, і сувеніры... Толькі не лянуйся, выбірай, дзяліся радасцю з блізкімі!

Можна, вядома ж, сэканоміць: паслаць віншаванні з дапамогай сучасных гаджэтаў. Але ж праз гады іх не патрымаеш у руках, не перачытаеш, не вернешся ў тыя часы, калі ўнукі пісалі сваё першае «віншую» і «жЫлаю»... Так-так, з памылкамі, ад чаго пісьмо было яшчэ даражэйшым.

Не ведаю, як вам, а мне хочацца верыць, што вернецца час, калі свае віншаванні мы будзем апускаць у паштовыя скрынкі. А галоўнае — калі ўвесь негатыў замяце белымі снягамі, калі ўсе на нашай зямлі будуць жыць у міры і шчасці.

Галіна Нічыпаровіч,
Уздзенскі раён.

МЫ ДАПАМОЖАМ ПТУШКАМ,

птушкі дапамогуць нам

...Не так даўно прачнуўся раніцай ад лёгкага шуму, расхінуў шторы і ўбачыў за акном сініцу. Падумаў яшчэ, якая ж смелая гэта разумніца: нагадала, што пара папоўніць кармушку.

Многія птушкі, як вядома, адлятаюць у вырай, многія застаюцца зімаваць, і тады іх ворагамі становяцца не столькі маразы і завеі, колькі голад. Летась мы час ад часу падкормлівалі сінічак бы вераб'ёў, разам з унукам любілі прагуляцца да першай гарадской школы. Росцік там чысціў ад снегу кармушкі, насыпаў розных круп, назіраў, як дружна частуюцца птушкі.

Таму сёлета мы з ім зрабілі кармушку дома і цяпер стараемся штодня ачышчаць яе, падсыпаць для крылатых свежага корму. Затраты на яго невялікія, а вось задавальненне — сапраўднае! Люба паглядзець, як злятаюцца птушкі (часам па пяць і болей)... Прычым сінічкі яшчэ могуць пасядзець на сцяне, пачакаць чаргі. Вераб'і больш хуліганістыя: часам злуюцца, ваююць, хоць корму хапае ўсім...

Лічу, што многія сем'і (асабліва тыя, дзе падрастаюць дзеці) маглі б дапамагаць птушкам. А яны ў сваю чаргу потым дапамагалі б нам змагацца са шкоднікамі ў садах і гародах, упрыгожваць жыццё сваімі спевамі.

Уладзімір Шык,
г. Паставы.

Рэзананс

Нам засталася спадчына

Шчыра ўдзячна газеце за публікацыю вельмі многіх артыкулаў, якія захоўваю ў адмысловых папках, але ж рада, што не прапусціла і невялічкі ліст з рэдакцыйнай пошты, надрукаваны 6 снежня сёлета. У ім мінчанін Максім Казлоў пісаў, як падчас вандроўкі з сябрамі апынуўся ў нашай вёсцы Сінкевічы, у старой драўлянай Свята-Георгіеўскай царкве («нібы ў музеі, дзе літаральна ўсё сапраўднае...»), як адчуў сябе «тым самым продкам-палешуком» і як хацеў бы прыцягнуць увагу да захавання гэтай палескай святыні.

Яна і сапраўды ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны. У раёне аб'яўлены збор ахвяраванняў на рэканструкцыю, апублікаваны дабрачынны рахунак.

Калекцыянеры, напэўна, маюць поўны набор сувенірнай прадукцыі, падоранай Лунінцу Міністэрствам сувязі і РУП «Белпошта». Гэта дзве паштоўкі, пяць канвертаў звычайных і два — з укладышам. На іх нашы вакзал, храм, іншыя віды горада...

А вось марка пакуль адна, яна выдадзена ў 2003 годзе і якраз з выявай Свята-Георгіеўскага храма ў Сінкевічах, з указаннем часу яго ўзвядзення — 1724 год. Адзінае...

Чым большая памылка, тым вышэйшая цана, — такі парадокс магчымы толькі ў філатэліі. Чаму нагадваю аб гэтым? Сінкевіцкая марка якраз з такіх: на карце Беларусі, намаляванай побач, іншым колерам выдзелена вобласць, дзе знаходзіцца храм. На жаль, нашу Лунінецкую славутасць аднеслі да Гомельшчыны і, адпаведна, да Усходняга Палесся. Але ж Сінкевічы знаходзяцца на Брэстчыне — Палессі Заходнім.

Цяпер мы рыхтуемся да ўрачыстасцяў з нагоды 300-годдзя храма і верым, што дзякуючы Максіму Казлову, яго сябрам ды іншым вандроўнікам, дзякуючы «Звяздзе» колькасць ахвотных убачыць святыню, каб захаваць, павялічыцца, і ў нас атрымаецца прыгожае царкоўна-грамадскае свята, нават не адно.

Таццяна Канапацкая,
г. Лунінец.

Падпіска-2024

«ЗВЯЗДА» НА ТОЕ І «ЗВЯЗДА»,

КАБ НЕСЦІ СВЯТЛО НАДЗЕІ

Здаўна (і ўжо не адзін дзясятак гадоў!) самыя неспрыяльныя дні ў мяне нядзеля і панядзелак, калі з паштовай скрынкі я не магу дастаць свежы нумар «Звязды». Атрымліваецца, што жыву (асабліва цяпер) у аўторак, сераду, чацвер, пятніцу і суботу...

Не вам казаць: кароткія зімовыя дні і вельмі шэрыя! Недзе ў сталіцы, у вялікіх гарадах людзям мо і святлей і радасней, а ў нас, у правінцыі...

Раней, каб палягчэла, можна было ўключыць тэлевізар. Цяпер — трэба доўга выбіраць, што глядзець там, а што — бронь божа, ці лепей не...

Глытком паветра, які жывіць, які дапамагае мне асабіста жыць ды выжываць, нават ад душы пасмяяцца калі-нікалі, застаецца «родная газета на роднай мове». А значыць, калі ласка, трымайце сувязь з народам, не абразайце так званы провад! «Звязда» на тое і «Звязда», каб несці святло.

М. Камароўскі,
г. Орша.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
20 снежня 2023 г. № 46 (732)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

«ВОПЫТ ТРЭБА РАСПАЎСЮДЗІЦЬ НА ЎСЕ РЭГІЁНЫ»

На пасяджэнні кансультатыўнага савета разгледзелі пытанні працаўладкавання маладых людзей з асаблівасцямі развіцця

Пад старшынствам спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ прайшло чарговае пасяджэнне кансультатыўнага савета пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Фота БелТА.



У Мінскім дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій, які Наталля КАЧАНАВА паставіла ў прыклад, навучэнцы з асаблівасцямі развіцця асвойваюць патрэбныя прафесіі, якія дапамогуць уладкавацца ў жыцці.

Наталля Качанава, адкрываючы сустрэчу, адзначыла, што папярэднія пасяджэнні праводзіліся ў Гомелі, Полацку, Мінску. Падчас іх была прааналізавана тая работа, якая праводзіцца дзяржаўнымі органамі кіравання ў сферы аховы здароўя, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны.

— Мы ўжо бачым, што можна вырашыць заканадаўча, што можна яшчэ зрабіць і што робіцца. Па вялікім рахунку, у нашай краіне работа выбудавана, прычым дастаткова нядрэнна. Іншая справа, што рэалізацыя гэтых мерапрыемстваў на месцах часам прыносіць не тыя вынікі, якія хацелі б бачыць бацькі і блізкія. Таму мы павінны аказваць садзейнічанне і прымаць аператыўныя рашэнні ў пытаннях, якія не знаходзяць часам свайго вырашэння ў гарадах і раёнах. Таму сёння мы запрасілі бацькоў, якія звярнуліся да нас, і хочам іх пачуць. Важна, каб у будучым мы не дапускалі такіх пытанняў, бо ў нас няма падстаў, каб яны не вырашаліся. Мы ўсё можам зрабіць на ўзроўні любога міністэрства і ведамства ў нашай краіне, — адзначыла Наталля Качанава.

Цяпер на парадку дня пытанні далейшага працаўладкавання хлопцаў і дзяўчат з асаблівасцямі развіцця.

— Я пабывала ў дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій, дзе ўбачыла, што сёння гэта работа ў нас праводзіцца, прычым дастаткова эфектыўна. Я насамрэч парадавалася за Мінск. Тое, што я ўбачыла, калі кантактавала з хлопцамі і дзяўчатамі, мяне вельмі ўразіла. Навучэнцам падабаецца вучыцца, і там працуе выдатны калектыў педагогаў, у тым ліку маладыя людзі, якія самі маюць праблемы са здароўем. Мы на правільным шляху. Важна ўвесці гэтых маладых людзей у соцыум, каб яны рэалізоўвалі сябе ў далейшым жыцці і прыносілі карысць дзяржаве, — выказала меркаванне Наталля Качанава.

Як расказаў **дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа лічбавых тэхналогій Георгій КОЗЕЛ**, цягам 18 гадоў у навучальнай установе функцыянуе Цэнтр інклюзіўнай адукацыі. У ім навучаюцца хлопцы і дзяўчаты з парушэннем зроку, слыху, апорна-рухальнага апарату і з расстройствам аўтыстычнага спектра. За гэты перыяд падрыхтавана больш за 700 спецыялістаў, 22 з іх мелі расстройства аўтыстычнага спектра. Усе выпускнікі былі працаўладкаваны па атрыманых спецыяльнасцях. Цягам двух гадоў пасля заканчэння каледжа ажыццяўляецца суправаджальнае працаўладкаванне і падтрымка на працоўным месцы кожнага з іх.

— Мы паставілі сабе звышзадачу — стаць апорным пунктам сістэмнай работы ў сталіцы па рэалізацыі нацыянальнай стратэгіі інклюзіўнай адукацыі і развіцці інклюзіўнай культуры, — адзначыў Георгій Козел.

Ён расказаў, што выкладчыкамі працуюць педагогі з такімі ж асаблівасцямі, як і навучэнцы. У тым ліку, тры татальна невідушчыя педагогі, два — з парушэннем слыху і маўлення. Адна з такіх выкладчыц, Анастасія Вярбовіна, разам з навучэнцам ў хуткім часе прыме ўдзел у міжнародным конкурсе маладых людзей-інвалідаў «Усходняя казка», які будзе праводзіцца ў Баку. Яны праспяваюць песні — голасам і жэставай мовай.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

На контуры знешнім і ўнутраным

Сенатары прымаюць удзел у міжнародных мерапрыемствах, знаёмяць моладзь з дзейнасцю Савета Рэспублікі і займаюцца дабрачыннасцю

● 18 снежня ў Маскве прайшло пасяджэнне 65-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, у якім прынялі ўдзел члены Савета Рэспублікі: Валерый Бельскі, Дзмітрый Баскаў, Валерый Гайдукевіч, Аляксей Кушнарэнка, Ірына Ляўковіч, Сяргей Рачкоў, Таццяна Рунец, Сяргей Сівец, Андрэй Шышкін. Саюзныя парламентарыі разгледзелі праект бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2024 год, змяненні ў Рэгламент Парламенцкага сходу, дапаўненні ў Дэкрэт Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2023 год», план-графік работы і план міжнароднай дзейнасці на будучы год. У рамках сесіі адбылася «ўрадавая гадзіна» на тэму «Міжрэгіянальнае і прыгранічнае супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы».

● З 15 па 17 снежня сенатары Ігар Гедзіч і Алег Дзячэнка прынялі ўдзел у міжнародным маніторынгу ходу падрыхтоўкі і правядзення датэрміновых парламенцкіх выбараў у Народную Скупшчыну Рэспублікі Сербія ў складзе місій міжнародных наглядальнікаў ад Парламенцкай Асамблеі АДКБ і ад Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД. Парламентарыі сустрэліся з Прэзідэнтам Сербіі Аляксандрам Вучычам, Старшынёй Парламента Сербіі Уладзімірам Орлічам, дэпутатамі Народнай Скупшчыны і прадстаўнікамі Сербскай народнай партыі. Сербскі бок падзякаваў міжнародным наглядальнікам, якія прыбылі ў Бялград з маніторынгавай місіяй, і падкрэсліў яе важнасць. Было адзначана, што сёння як ніколі важна працягваць бесперапыннае міжпарламенцкае супрацоўніцтва і падтрымліваць пастаянныя кантакты парламенцкіх груп сяброўства.

● У Савеце Рэспублікі была арганізавана экскурсія для вучняў 11 класаў і гімназіі горада Пружаны Брэсцкай вобласці. Школьнікі сустрэліся са **старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаілам РУСЫМ**. Сенатар расказаў аб гісторыі беларускага парламентарызму, фарміраванні, структуры і асноўных паўнамоцтвах Савета Рэспублікі, заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці парламентарыяў. Размова ішла і аб тым, як мадэль дзяржаўнага ладу ўплывае на функцыі і паўнамоцтвы парламента, як фарміруецца і функцыяне Савет Рэспублікі. Сенатар пазнаёміў прысутных з работай камісіі, якую ён узначальвае. Член Прэзідыума Савета Рэспублікі адзначыў актыўны ўдзел Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь у прагрэсіўным руху развіцця Беларусі. Навучэнцы гімназіі дзяліліся меркаваннямі, задавалі пытанні.

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня РГА «Белая Русь», старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ** у рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» наведаў Слуцкі спецыялізаваны дом дзіцяці для дзяцей з арганічным паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы і парушэннем псіхікі. Удзельнікамі акцыі сталі актывісты Слуцкай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь». Для гасцей была прадстаўлена навагодняя праграма з удзелам выхаванцаў дома дзіцяці.

Вераніка КАНЮТА.

«ВОПЫТ ТРЭБА РАСПАЎСЮДЗІЦЬ НА ЎСЕ РЭГІЁНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Праект па навучанні асоб з расстройствам аўтыстычнага спектра будзе пашырацца. У наступным годзе ў каледж плануюць набраць амаль 40 асаблівых абітурыентаў — выпускнікоў і 9, і 11 класаў. Адметна, што праект рэалізуецца без прыцягнення бюджэтных сродкаў, а пры дапамозе людзей, нераўнадушных да праблем дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, у тым ліку прадстаўнікоў Парка высокіх тэхналогій.

Дырэктар каледжа спыніўся і на праблемных момантах. На жаль, не ўсе арганізацыі і прадпрыемствы праяўляюць зацікаўленасць у працаўладкаванні выпускнікоў з асаблівасцямі развіцця.

Наталля Качанава адрэагавала на праблему і прапанавала запрасіць кіраўнікоў прадпрыемстваў і намеснікаў старшынь аблвыканкамаў на сустрэчу ў каледжы з навучэнцамі і педагогамі.

Георгій Козел прапанаваў і крокі для фарміравання больш высокага ўзроўню інклюзіўнай культуры нашага грамадства.

— Калі да нас прыходзяць асаблівыя дзеці, яны не гатовы кантактаваць ні паміж сабой, ні з педагогамі і не гатовы ў тэхнічным плане. У многіх дома нават няма камп'ютараў. І каб іх падцягнуць, павінна добра працаваць сістэма дадатковай адукацыі, менавіта гурткоўая. Было б добра, каб цэнтр тэхнічнай творчасці на базе былога аўтавакзала «Усходні» стаў каардынацыйнай пляцоўкай для такой падрыхтоўкі, — звярнуў увагу кіраўнік каледжа.

Наталля Качанава станоўча ацаніла работу каледжа, у тым ліку і па працаўладкаванні выпускнікоў.

— Гэты вопыт неабходна распаўсюдзіць на ўсе вобласці, каб у кожнай быў вызначаны каледж, дзе будуць створаны аналагічныя ўмовы, бо не ва ўсіх дзяцей атрымаецца прыехаць у Мінск. Самае важнае, што ёсць людзі, якія эфектыўна працуюць у гэтым напрамку, створаны выдатны калектыў педагогаў, які нацэлены на гэту работу. Нам трэба пераглядзець падыходы па працаўладкаванні: атрымліваецца, што маладому чалавеку з асаблівасцямі не ўладкавацца, усюды абмежаванні і забароны. Трэба больш пільна паглядзець, дзе маладыя людзі могуць сябе рэалізаваць, — даручыла кіраўніцтву органаў дзяржкіравання Наталля Качанава.

Начальнік сакратарыята назіральнага савета Парка высокіх тэхналогій Аляксандр БАЗАНАЎ расказаў, што ранейшае даручэнне спікера Савета Рэспублікі, каб людзі з расстройствам аўтыстычнага спектра маглі інтэгрыравацца ў ІТ, выконваецца.

Таксама да спікера верхняй палаты звярнулася маці хлопца з аўтызмам, які марыць стаць акцёрам. Удзельнікі пасяджэння прапанавалі ўстановам адукацыі разгледзець магчымасць мэтавага набору выпускнікоў з асаблівасцямі.

Алена КРАВЕЦ.

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

І ГОНАР, І ПРАКТЫЧНЫ ДОСВЕД

У Савет Рэспублікі дэлегацыі з раёнаў прывозяць не толькі выставы, але і ідэі

У Савеце Рэспублікі замацавалася добрая традыцыя наведвання яго прадстаўнікамі мясцовага самакіравання. Дэпутаты мясцовага ўзроўню не толькі прэзентуюць свае раёны, расказваюць аб дасягненнях і праблемах, але і прымаюць удзел у сесіях, дэталёва знаёмяцца з работай парламентарыяў.

Фота з Савета Рэспублікі.

Дэлегацыя Любанскага раёна прадставіла выставу, якая адлюстроўвала гістарычныя этапы развіцця Любаншчыны і яе сучаснасць. Праз прызму часу яскрава відаць, які няпросты шлях прайшоў рэгіён, як ён выстаяў у Вялікую Айчынную, як аднаўляўся ў нялёгкі пасляваенны час і чаго дасягнуў у перыяд незалежнай Беларусі. Чырвонай ніткай прэзентацыі была думка, што галоўнае багацце раёна — яго людзі: сціплыя і працалюбівыя, таленавітыя і неабыякавыя да лёсу малой радзімы і дзяржавы.

— У зносінах з людзьмі галоўнае — не быць фарміялістам, — зазначыў **старшыня Любанскага райсавета дэпутатаў Андрэй ДРАБУДЗЬКА**. — Толькі сапраўдная цікавасць да іх праблем і да іх асабіста дапамагае наладзіць добры, узаемакарысны дыялог. Бо калі не ўнікнеш у сутнасць звароту, то і не варта гаварыць аб нейкім станоўчым выніку. Тым больш што менавіта людзі — нашы галоўныя дарадцы, падказчыкі і кантралёры. Гэта вялікая адказнасць, вялікі давер, які трэба апраўдваць штодзённа.

Падчас наведвання Савета Рэспублікі мне як старшыні раённага Савета дэпутатаў было карысна даведацца пра арганізацыю работы ў верхняй палаце парламента. І, канешне, узяць на ўзбраенне найбольш эфектыўныя яе метады.

Падчас размовы са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай мясцовыя дэлегаты ад Любаншчыны абмеркавалі надзённыя пытанні жыцця раёна. Сярод іх і медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, у прыватнасці замацаванне маладых урачоў, закранулі тэму выдзялення ім, і не толькі, арэнднага жылля. Многа было сказана аб спорце і адукацыі, развіцці сацыяльнай інфраструктуры і захаванні культурных каштоўнасцяў, гістарычнай спадчыны. Асобным радком — развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі, бо дабрабыт рэгіёна залежыць у першую чаргу ад яго эканомікі. Наталля Качанава ўважліва аднеслася да ўсіх пытанняў, узнятых прадстаўнікамі мясцовай улады, імкнулася зразумець іх хваляванні і турботы. Дарэчы, усе ўдзельнікі сустрэчы адзначылі атмасферу цяпла і добразычлівасці, у якой яна прайшла.

— Я прадстаўляла Урэцкі сельвыканкам, расказвала пра яго асаблівасці і адметнасці. У нас шматнацыянальны склад насельніцтва, бо ў свой час тут было многа воінскіх часцей і многія ваенныя, афіцэры пасля заканчэння службы аселі ў нас. Вядома, гэта накладвае сур'ёзны адбітак на работу, надае ёй пэўныя асаблівасці і дадатковую адказнасць, — гаворыць **старшыня сельвыканкама Ядвіга ЯРОХІНА**. — І мяне вельмі ўразіла, як шчыра, з непадробнай цікавасцю паставілася да нашых клопатаў Наталля Іванаўна Качанава.

Такія запрашэнні, асабліва ўдзел у сесіі Савета Рэспублікі, вельмі важныя, яны дазваляюць адчуць непасрэднае дачыненне да заканатворчага працэсу, данесці на самы высокі ўзровень усё тое, чым жыве рэгіён: і яго дасягненні, і цяжкасці, з якімі сутыкаюцца жыхары.

Так, гэта сапраўды важны момант. Удзельнічаючы ў пасяджэннях, мясцовыя дэпутаты на свае вочы бачаць, як праходзяць абмеркаванне і экспертыза законапраектаў, іх прыняцце.

— Такі досвед, безумоўна, — важкая дапамога ў рабоце, а таксама і матывацыя ў далейшым, — у сваю чаргу адзначыла **намеснік старшыні Любанскага райвыканкама Тамара ДАМАШЭВІЧ**. — Запрашэнне ў Савет Рэспублікі, прадстаўленне там роднага краю — гонар, бо гэта дзесьці і прызнанне заслуг раёна, і ацэнка работы нашага мясцовага самакіравання. Адначасова, падчас падрыхтоўкі да сустрэчы з парламентарыямі, мы нібыта паглядзелі на раён збоку. А такі погляд заўсёды патрэбны і карысны — своеасаблівая рэвізія зробленага і карэкціроўка планаў на будучыню. Калі ж казаць увогуле аб уражаннях, то яны самыя станоўчыя і запамінальныя. Я даўно працую, шмат дзе бывала, але гэтае наведванне падарыла, бадай, самыя яскравыя эмоцыі.

Падсумоўваючы вынікі сустрэчы, **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ**, засяродзіла ўвагу на тым, што ўдзел мясцовых дэпутатаў у сесіях Савета Рэспублікі прыносіць шмат плёну. Гэта не толькі магчымасць паўдзельнічаць у заканатворчасці, але і свайго роду стымул да заканадаўчых ініцыятыў, якія выходзяць ад мясцовых улад.

— Так павінна быць, — дадала яна. — Дэпутаты мясцовага ўзроўню бліжэй за ўсіх да людзей, яны ведаюць, што трэба зрабіць у першую чаргу. Хто, як не яны, падкажуць найбольш эфектыўныя спосабы вырашэння тых ці іншых праблем? Таксама менавіта мясцовыя дэпутаты могуць загадзя папярэдзіць магчымыя хібы ў механізмах рэалізацыі пэўных заканадаўчых актаў. Адзначу і тое, што падчас сустрэчы надта ўразіла нават не сама прэзентацыя Любаншчыны, якая, дарэчы, была вельмі цікавай і змястоўнай, а тое, з якой любоўю да свайго краю расказвалі пра свае сельсаветы іх старшыні. Адразу адчуваеш, што перад табою людзі на самай справе апантаныя сваёй працай, неабыякавыя і шчырыя, сапраўдныя патрыёты.

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

ЗАНЯТАК ДЛЯ СЕЛЯНІНА

У Чавускім раёне абмеркавалі, як падтрымаць жыхароў у іх гаспадарчай дзейнасці

Міжрэгіянальны выязны семінар прайшоў на базе Гарбавіцкага сельсавета ў Чавускім раёне. Ён стаў працягам тэмы па развіцці ўласных падсобных гаспадарак, якая закраналася на пляцоўках іншых раёнаў вобласці. У семінары прынялі ўдзел старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК, прадстаўнікі кіраўніцтва Чавускага раёна, а таксама старшыні раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў Горацкага, Крычаўскага, Мсціслаўскага і Шклоўскага раёнаў і іншыя.

У сельскім Доме народнай творчасці можна было ўбачыць прадукцыю, якая ствараецца працавітымі рукамі жыхароў названых раёнаў. На сталах чаго толькі не было: пачынаючы ад садавіны-гародніны і мёду, заканчваючы сырамі розных сартоў, саленнямі, каўбасамі і іншай смакатой.

Насуперак песімістычным разважанням, што на вёсцы няма чым займацца, самі вяскоўцы дэманстравалі супрацьлегласе. Як потым агучвалася на нарадзе, толькі на тэрыторыі Гарбавіцкага сельсавета, дзе зарэгістравана 853 домаўладанні, развіццём уласных падсобных гаспадарак займаюцца ў 658 з іх. Усяго ў Чавускім раёне 1299 асабістых падсобных гаспадарак. Найбольш папулярныя кірункі ў насельніцтва — пчалярства і жывёлагадоўля. Жыхары займаюцца вырошчваннем свіней, авечак, коз, коней, птушак. Адныя толькі кароў і цялят на падворках жыхароў невялікага Чавускага раёна 444.

За 11 месяцаў насельніцтва здало 826 тон малака, прычым толькі на тэрыторыі Гарбавіцкага сельсавета сабрана каля 126 тон. Лішкі гэтай прадукцыі закупляе Чавускае райспажыўтаварыства і ААТ «Рудзея Гранд». Акрамя гэтага, у насельніцтва закуплена 23 галавы маладняку.

Вопытам развіцця ўласных падсобных гаспадарак на семінары падзяліліся старшыні Крычаўскага і Мсціслаўскага райсаветаў дэпутатаў Ірына Пруднікава і Алена Клеянкова. Старшыня Мсціслаўскага райсавета адзначыла, што людзі выказваюць пажаданні, каб ім крыху спрасцілі ўмовы рэалізацыі прадукцыі.

У рабоце семінара прымалі ўдзел прадстаўнікі банка і зямельнай службы. Яны давялі да жыхароў карысную інфармацыю наконт атрымання ўчасткаў пад агародніцтва, а таксама афармлення льготнага крэдыту.

— Падчас нашых міжрэгіянальных сустрэч па пытаннях развіцця асабістых падсобных гаспадарак мы прыйшлі да высновы, што гэтым кірункам займаюцца ў асноўным людзі сярэдняга ўзросту, — падкрэсліла старшыня аблсавета дэпутатаў Ірына Раінчык. — Але моладзь таксама праяўляе інтарэс. Дэпутаты зацікаўлены, каб на такіх сустрэчах узнімаліся і праблемныя пытанні. Гэтаму кірунку сёння ў краіне ўдзяляецца вельмі вялікая ўвага. Для стымулявання развіцця асабістых падсобных гаспадарак грамадзян на тэрыторыі нашай вобласці і павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі сёлета ў рамках дзяржпраграмы «Аграрны бізнес» са сродкаў бюджэту выдзелена фінансаванне для надбавак да закупачных цэн за рэалізаванае малако і маладняк буйной рагатай жывёлы.

Як правіла, ад ініцыятыўных і актыўных людзей залежыць і парадак на сяле. Не рэдкасць, калі яны выступаюць за развіццё сваіх населеных пунктаў і добраўпарадкаванне культурных месцаў. Дарэчы, частковае фінансаванне пад нейкія грамадскія ініцыятывы, у якіх зацікаўлены жыхары вёскі, прапануе Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. Па словах яе дырэктара Паліна Церашковай, падтрымку атрымліваюць тыя праекты, дзе насельніцтва гатовае прыняць удзел у стварэнні ўмоў для агульнага адпачынку, заняткаў спортам, гульняў для дзяцей і гэтак далей.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

ВЫЗНАЧЫЦЬ БУДУЧЫНЮ

Як выбарчая кампанія паспрыяла дыялогу паміж моладдзю і ўладай

Чаму важна ісці на выбары? Якая роля мясцовых Саветаў у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі? Хто адказвае за бяспеку падчас выбарчай кампаніі? Які працэнт моладзі павінен быць у парламенце? На гэтыя і іншыя пытанні студэнты ГрДУ імя Я. Купалы атрымалі адказ ад першых асоб вобласці, парламентарыяў і дэпутатаў падчас дыялогавай пляцоўкі «Моладзь і выбары — формула адказнасці».

Выбарчая кампанія ў краіне стартавала. У Гродзенскай вобласці праведзена значная арганізацыйная работа. Створана 60 акруг па выбарах дэпутатаў у абласны Савет дэпутатаў 29 склікання. Сфарміраваны выбарчыя камісіі і пачаўся этап вылучэння кандыдатур. Як вядома, сёлетняя кампанія прадугледжвае выбары дэпутатаў усіх узроўняў — ад сельскіх Саветаў да Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Моладзь таксама не застаецца ў баку ад грамадска-палітычнага жыцця краіны.

— Абласныя ўлады падтрымалі ініцыятыву дэпутатаў абласнога маладзёжнага Савета аб правядзенні такой сустрэчы, дзе можна атрымаць кампетэнтныя адказы на хвалюючыя пытанні, — зазначыла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**. — Вырасла новае пакаленне маладых людзей, якія ідуць на змену сваім бацькам. Улада павінна быць побач з моладдзю, каб дапамагчы фарміраваць адказнасць за сучаснасць і будучыню Беларусі.

На думку **старшыні абласнога выканаўчага камітэта Уладзіміра КАРАНІКА**, задача спікераў сустрэчы — не навязаць свой пункт гледжання, а аргументавана дапамагчы знайсці адказ на пытанне «Чаму важна ісці на выбары?». Між тым змены ў Канстытуцыі, якія былі прыняты ў мінулым годзе, даюць больш шырокія магчымасці для рэалізацыі палітычных амбіцый моладзі. Гэта ўдзел у партыйным будаўніцтве, рабоце мясцовых Саветаў, грамадскіх арганізацый. Прадстаўнікі моладзі могуць стаць дэлегатамі УНС.

— Будучыня любой краіны вызначаецца ў кабінках для галасавання, а не на плошчах. І калі мы не скарыстаемся сваім правам вызначаць сваю будучыню, у кагосьці можа з'явіцца спакуса вызначаць гэту будучыню за нас менавіта праз вулічныя акцыі. Але ні адна краіна, дзе змена ўлады адбылася праз плошчы, не змагла забяспечыць устойлівае развіццё і шчасце сваім грамадзянам. А мы хочам, каб будучыня нашай краіны была звязана з развіццём, бяспекай, каб мы не толькі захавалі тое, што маем, але і прымножылі здабыткі. Тады і наступныя пакаленні будуць жыць у камфортнай краіне і ганарыцца тым, што яны грамадзяне Беларусі. Таму мы гатовы сустракацца на такіх пляцоўках, дыскутаваць, — адзначыў Уладзімір Каранік.

Выбары — неад'емны працэс развіцця кожнай дэмакратычнай дзяржавы, адна з формаў удзелу грамадзян у яе ўпраўленні. Гэта магчымасць прыняць удзел у абранні тых, каму выбаршчыкі давяраюць далейшае развіццё краіны. Па словах **рэктара ГрДУ імя Я. Купалы Ірыны КІТУРКА**, звыш 6 тысяч студэнтаў ВНУ прымуць удзел у электаральнай кампаніі, з іх 3 тысячы чалавек ажыццявяць гэта права ўпершыню.

Падчас сустрэчы маладыя ўдзельнікі даведаліся, як працуе беларускі парламент і колькі маладых прадстаўнікоў у заканадаўчым органе. Як расказала **член Савета Рэспублікі Эльвіра САРОКА**, падчас работы парламента сёмага склікання было разгледжана звыш 320 законапраектаў, больш за 200 законаў прынята. У іх ліку тыя, што завяршаюць канстытуцыйнае будаўніцтва. Гэта законы аб Прэзідэнце, аб палітычных партыях, аб Усебеларускім народным сходзе. Будучая электаральная кампанія завершыць працэс маштабных палітычных пераўтварэнняў краіны.

Аб удзеле маладых парламентарыяў у заканадаўчай дзейнасці расказала **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Алена ПАТАПАВА**. Яна прывяла такую статыстыку. У ніжняй палаце парламента моладзь складае 10 % агульнай колькасці дэпутатаў. Гэта людзі, чый узрост на момант абрання не перавышаў 35 гадоў. Дарэчы, сёння ў парламенце працуе і самы малады дэпутат за ўсю гісторыю беларускага парламентарызму. Пачынаецца новая электаральная кампанія, і маладыя людзі, якія дасягнулі 21 года, могуць паспрабаваць ступіць на палітычны шлях.

Удзельнікаў сустрэчы цікавілі і тэхнічныя пытанні будучых выбараў. Напрыклад, якія меры бяспекі будуць прыняты, а таксама ці не плануецца зрабіць бюлетэні рознага колеру, каб выбаршчыкі не блыталіся падчас галасавання. Што датычыцца мер бяспекі, яны, па словах **памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Юрыя КАРАЕВА**, будуць беспрэцэдэнтнымі. Усе моманты адпрацаваны, усе нестандартныя сітуацыі ўлічаны. Ніякіх інцыдэнтаў, у тым ліку нападзенняў на членаў камісіі альбо прадстаўнікоў аховы парадку, дапушчана не будзе. Кожны з выбаршчыкаў можа быць упэўнены ў бяспецы.

А вось на пытанне, ці будуць адрознівацца бюлетэні пры галасаванні, пакуль канкрэтнага адказу няма, хоць пытанне такое разглядаецца. Сапраўды, чалавек атрымае на рукі чатыры, у іншым выпадку тры бюлетэні і можа заблытацца. З боку гродзенцаў паступіць такая прапанова ў Цэнтральную выбарчую камісію. Магчыма, бюлетэні будуць адрозніваца па колеры ці неяк інакш. Ва ўсялякім выпадку дапамогу падчас выбараў будуць аказваць валанцёры.

У іх ліку і ўдзельніца сустрэчы, студэнтка 3 курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Мілана Шаргаева. Яна заўважыла, што падчас дыялогавай пляцоўкі даведалася шмат карыснага. Студэнтка ўпэўнена, што гэты вопыт дапаможа ёй у будучай дзейнасці, грамадскім жыцці.

На думку студэнткі 2 курса філалагічнага факультэта Уладзіславы Мотыль, адкрыты дыялог дапамог ёй больш поўна ўвайсці ў выбарчую сістэму, зразумець механізм яе дзейнасці, а галоўнае — зразумець важнасць удзелу ў выбарчай кампаніі. Яна, як і іншыя студэнты, прынялі да ведама прапанову губернатара зняць невялікі ролік, у якім яны раскажуць, чаму вырашылі ісці галасаваць на выбарах.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ПАТРЫЯТЫЗМ У МІЖНАРОДНЫМ ФАРМАЦЕ

Дэпутаты Магілёўшчыны і Хабараўскага краю абмеркавалі па відэасувязі тэму выхавання моладзі

Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў у анлайн-рэжыме прыняў удзел у пасяджэнні Савета старшынь прадстаўнічых органаў муніцыпальных утварэнняў пры Заканадаўчай думе, дзе абмяркоўваліся дасягненні сістэмы патрыятычнага выхавання. Расіянам было цікава даведацца пра досвед работы беларускіх народных абраннікаў у гэтым кірунку.

Старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК расказала, як у маштабах Магілёўскай вобласці рэалізоўваецца Праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гады. Сёлета, у Год міру і стваральнай працы, гэта тэма была адной з галоўных.

— Мір на зямлі немагчымы без гістарычнай памяці, а стваральная праца — гэта пераемнасць гістарычнага шляху, крок у будучыню. Менавіта такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, — адзначыла спікер. — Разам з грамадскімі аб'яднаннямі, Маладзёжным парламентам, органамі выканаўчай улады мы праводзім сістэмную работу, накіраваную на патрыятычнае выхаванне маладога пакалення і фарміраванне ў іх пачуцця гонару за гераічнае мінулае сваёй краіны, адказнасці за будучыню.

Ірына Раінчык акцэнтавала ўвагу на маштабным праекце, які рэалізоўваецца ў Магілёўскай вобласці «#Мая_Зямля_Прыдняпроўе». Ён прадугледжвае стварэнне інтэрактыўнай карты і мабільнага дадатку. Усё гэта можна будзе выкарыстоўваць пры правядзенні ўрокаў, экскурсій, квэстаў, паходаў па гістарычных месцах. Не менш важны і карысны інфармацыйна-адукацыйны праект «Школа Актыўнага Грамадзяніна», дзе на сустрэчу з моладдзю прыходзяць прадстаўнікі органаў улады, грамадскіх арганізацый, лідары меркаванняў, сенатары, дэпутаты. Агучваюцца факты і вынікі Вялікай Айчыннай вайны, расказваецца пра генацыд, абмяркоўваюцца сённяшнія геапалітычныя падзеі. Шмат адбываецца цікавых сустрэч і мерапрыемстваў на базе абласнога патрыятычнага Цэнтра, які створаны пры Магілёўскім абласным кадэцкім вучылішчы імя Героя Савецкага Саюза Яўгена Нікалаенкі. У вобласці працуе 59 маладзёжных патрыятычных клубаў.

Ірына Раінчык заклікала да больш цеснага супрацоўніцтва паміж моладдзю Беларусі і Расіі і нагадала пра такія папулярныя міжнародныя патрыятычныя мерапрыемствы, як «Дарогамі памяці і славы!», «Сімвалы інтэграцыі: расійскае і беларускае адзінства ў фактах культуры», інтэлектуальны турнір «Вялікая Айчынная вайна ў лёсе народаў Беларусі і Расіі», ваенна-патрыятычны форум «Мы — абаронцы Айчыны».

Старшыня Заканадаўчай думы Хабараўскага краю, старшыня Савета старшыняў прадстаўнічых органаў муніцыпальных утварэнняў Хабараўскага краю пры Заканадаўчай думе Хабараўскага краю Ірына ЗІКУНОВА падтрымала прапанову. Яна адзначыла, што вопыт Магілёўскай вобласці для расійскага рэгіёна таксама важны і карысны.

— Мы цэнім наша супрацоўніцтва і гатовы яго ўмацоўваць, а некаторыя праекты, якія рэалізоўваюцца на Магілёўшчыне, узялі на заметку і хочам рэалізаваць з нашай моладдзю, — падкрэсліла яна. — Сёння вельмі важна выхоўваць моладзь на традыцыях, гістарычным вопыце, вернасці сваёй зямлі і абароне яе суверэннасці. І гэту работу, безумоўна, трэба рабіць разам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШКОЛА, СЯМ'Я, РАДЗІМА

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне насельніцтва: сіла патрыятызму ў трывалай сувязі пакаленняў. Менавіта такую тэму прапанаваў Лельчыцкі раён для правядзення апошняга ў гэтым годзе традыцыйнага навучальнага семінара старшынь раённых Саветаў дэпутатаў Гомельшчыны. Удзельнікаў сустрэчы прывіталі старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ, старшыня Лельчыцкага райвыканкама Сяргей ДЫЛЮК і старшыня Лельчыцкага райсавета дэпутатаў Таццяна БЯСПАЛАЯ.

Вясковыя брэнды

Лельчыцкі раён — самы буйны па тэрыторыі на Гомельшчыне і другі ў Беларусі пасля Століншчыны. Па ініцыятыве Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў з пачатку года ўсе 12 сельсаветаў распрацавалі турыстычныя брэнды сваіх тэрыторый. За аснову ўзялі самыя розныя ідэі: ад народных традыцый і свят да патрыятычных, экалагічных маршрутаў, прамысловага турызму. Гэты перадавы для сельскіх населеных пунктаў вобласці вопыт добра спрыяе грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню мясцовых жыхароў.

Што ўяўляе сабой раён, як яго жыхары захоўваюць гісторыка-культурную спадчыну, расказаў старшыня Лельчыцкага райвыканкама Сяргей Дылюк.

Як нагадаў кіраўнік раёна, падчас Вялікай Айчыннай вайны сэрца Палесся — лясісты і балоцісты Лельчыцкі раён — стала месцам значных партызанскіх бітваў. За супраціўленне акупанты жорстка помсцілі: для запалохвання насельніцтва, здаралася, спальвалі і забівалі жыхароў вёсак. Нездарма гісторыкі называюць Лельчыцкі край Палескай Хатынню.

— Чатыры вёскі на тэрыторыі раёна — Мілашавічы, Глушкавічы, Прыбалавічы, Тонеж — сёстры Хатыні. Вёску Тонеж, дарэчы, фашысты спалілі разам з людзьмі якраз на Каляды. Людзі вярнуліся ў свае дамы з лесу, дзе хаваліся, спадзяваліся, што карнікі не адважацца нападаць на вёску ў вялікае свята, — нагадаў Сяргей Дылюк. — На тэрыторыі раёна праходзіць частка Мазырскага ўмацаванага раёна «Лінія Сталіна», — дадаў кіраўнік рэгіёна.

Юныя экскурсаводы

Падчас семінара дэпутатам прапанавалі пазнаёміцца з праектамі па грамадзянска-патрыятычным выхаванні, якія ажыццяўляюць дзеці, іх педагогі, бацькі.

— У раёне 19 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і 13 дашкольнай. Каля 4200 дзяцей у раёне — школьнікі і дашкольнікі, плюс каля 8 тысяч — бацькі, бабулі, дзядулі, паўтары тысячы — педагогі. Так, амаль 65 % жыхароў раёна ахоплены сістэмай адукацыі, а менавіта ёй адводзіцца адна з вядучых роляў па патрыятычным выхаванні моладзі. Працуем ва ўзаемадзеянні з бацькамі, сем'ямі, — адзначыў **начальнік аддзела адукацыі Лельчыцкага райвыканкама Уладзімір ГРЫБ**.

На базе Лельчыцкай раённай гімназіі імя Івана Андрэевіча Коласа дэпутатам прадставілі свае праекты не толькі школьнікі, але і дашкаляты. Навучэнцы гімназіі, напрыклад, каторы год выступаюць у ролі экскурсаводаў, робяць прэзентацыі аб ваеннай гісторыі роднага гарадскога пасёлка, яе вядомых ураджэнцах і жыхарах. Многіх старшакласнікаў вывучаць гісторыю сваёй малой радзімы натхніла ў тым ліку гісторыя жыцця легендарнага савецкага ваеннага разведчыка, партызана, журналіста і пісьменніка, Героя Расійскай Федэрацыі Івана Андрэевіча Коласа, імя якога носіць раённая гімназія.

— Гераічны ўклад у гісторыю раёна ўнесла і дзейнасць маладзёжнай арганізацыі пад кіраўніцтвам Мікалая Кудзіна і Міхаіла Чачко. У склад групы ў асноўным увайшлі юнакі і дзяўчаты — удзельнікі мастацкай самадзейнасці раённага Дома культуры. Група сабрала станок для друкавання ўлётак, інфармавала людзей аб становішчы на франтах, дапамагала мясцовай моладзі пазбегнуць выгану ў Германію, вызваляла арыштаваных з турмы. У ліпені 1942 года падпольная маладзёжная група была раскрыта, падпольшчыкаў арыштавалі, толькі некаторым з іх цудам удалося выжыць, — аб адной са старонак з жыцця Лельчыцкага краю падчас фашысцкай акупацыі дэпутатам расказалі юныя экскурсаводы. Лельчыц. Яны прадставілі праекты «Юныя лесаводы» і «Юныя патрыёты». Адна з самых папулярных у раёне сярод дашкольнікаў і іх бацькоў — акцыя «Дзеці міру — дзецям вайны».

— Дзеці наведваюць былых малалетніх вязняў канцлагераў. Прыносяць падарункі, робяць сваімі рукамі вялікую паштоўку. На Новы год малыя ператвараюцца ў дзядоў марозаў і снягурак, і з падарункамі, віншаваннямі таксама прыходзяць у госці да пажылых людзей. Нашы дашкольнікі ўвогуле актыўныя ўдзельнікі ўсіх святочных дэманстрацый, акцый, конкурсаў не толькі раённых, але і абласных, рэспубліканскіх, — распавялі лельчыцкія педагогі.

Акрамя таго, вучні падзяліліся, як ствараюць галерэю гонару заслужаных і ганаровых грамадзян Лельчыцкага раёна.

Хто любіць прыроду, шануе і Радзіму

Сваімі напрацоўкамі па грамадзянска-патрыятычным выхаванні падзяліліся і педагогі дашкольных устаноў адукацыі

Жыць па Божых запаведзях

Падчас семінара дэпутатаў запрасілі наведаць храм Святой Жыццепачатай Троіцы ў Лельчыцах. Пра ролю духоўнага выхавання расказаў **іерэй Ігар ФЕДАРОВІЧ**. Ён нагадаў, што любоў да Радзімы пачынаецца з любові да сям'і і дому.

— Праз хрысціянскія паняцці любові, пашаны да сваіх бацькоў, старэйшых, у цэлым беражлівых адносін да ўсіх і ўсяго навакольнага мы вучымся любові да сваёй сям'і, да свайго народа, да сваёй Радзімы, — нагадаў настаяцель храма, які асвяціл 23 гады таму, дагэтуль з 1935 года праваслаўнага храма ў Лельчыцах не было.

Храм праходзіць праз усё жыццё чалавека, ад нараджэння да спачыну. Яго ролю, ролю хрысціянскай веры ў духоўна-маральным станаўленні чалавека цяжка пераацаніць, перакананы іерэй Ігар Федаровіч.

Паназіраць за вясельным абрадам продкаў

Лельчыцкая зямля сапраўды асаблівая і народным, культурным багаццем, як змаглі ацаніць дэпутаты Гомельшчыны. З абрадам як жывой культурнай з'явай прапанавалі пазнаёміцца ўдзельнікі калектываў філіялаў Дзяржынскага і Ліплянскага сельскіх дамоў культуры. Фальклорны калектыў «Пралеска» прадэманстраваў элемент вясельнага абраду «Радзілавіцкае вяселле» — завіванне наміткі». На дадзены момант ідзе падрыхтоўка дакументаў для надання гэтаму абраду статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі. Удзельнікі фальклорнага калектыву філіяла «Ліплянскі сельскі Дом культуры» паказалі і расказалі дэпутатам, якое і ў які час насілі адзенне нашы продкі.

— На тэрыторыі нашага раёна захаваліся палескія дыялекты, песні, народныя традыцыі, старажытныя абрады. З 15 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Гомельшчыны, уключаных у Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі, чатыры аб'екты знаходзяцца ў Лельчыцкім раёне. Гэта мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадаў і абрадавых твораў калектывам «Палескія напевы», абрад пакланення каменным крыжам «Каменныя дзяўчынкі», лясное бортніцтва, вясновы абрад гукання вясны «Чырачка». Дарэчы, абрад «Чырачка» захаваўся дзякуючы ўдзельніцам народнага фальклорнага калектыву «Таняжанка». За значныя дасягненні ў захаванні традыцый Палесся калектыў удастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі, — нагадалі ўдзельнікі фальклорных калектываў.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч падзякавала жыхарам Лельчыцкага раёна за ўнікальную магчымасць пабачыць, як яны захоўваюць і развіваюць культурную спадчыну малой радзімы.

— Тэма грамадзянска-патрыятычнага выхавання выбіралася за аснову правядзення навучальных семінараў з удзелам старшынь раённых Саветаў дэпутатаў Гомельшчыны неаднойчы. Але заўжды гэту тэму ў раёнах прапаноўвалі разгледзець па-рознаму. Нашы калегі імкнуліся паказаць нешта сваё, як яны на месцах арганізоўваюць гэтую работу з людзьмі, — падкрэсліла Кацярына Зенкевіч.

Кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна нагадала, што пастановай Савета Міністраў № 773 у 2021 годзе была зацверджана рэспубліканская пяцігадовая праграма патрыятычнага выхавання насельніцтва. У развіццё гэтай праграмы на абласным узроўні быў распрацаваны план мерапрыемстваў.

— Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне — адзін са складнікаў умацавання суверэнітэту нашай дзяржавы, выхавання нашага падрастаючага пакалення. Я лічу, што сёння шмат робіцца ў рэгіёнах, на месцах, у краіне ў цэлым, каб нашы дзеці з маленства разумелі, што значыць быць патрыётам, любіць сваю краіну. Сёлета чатыры семінары ў той ці іншай ступені закраналі пытанне патрыятычнага выхавання. Так, складана за адзін семінар перадаць гэту тэму цалкам, таму што ў раёнах вельмі шмат форм работы праводзяць у гэтым кірунку, — падкрэсліла старшыня абласнога Савета дэпутатаў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.312. **Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2023 года.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

ПАСТАВЫ

У «віцебскай» частцы філакартычнай калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава Паставы і Пастаўшчына займаюць годнае месца. Ёсць выявы агульнага зімовага выгляду Пастаў пачатку XX стагоддзя. Ёсць паштоўка, якая напамінае пра маштабны, перапоўнены людзьмі і жывёлай рынак у Паставах. А яшчэ — гандлёвыя рады ў горадзе ў 1930-я гады. І ашчадная каса, здымак прыблізна гэтага ж часу. Пра канец XIX стагоддзя нагадвае выява будынка афіцэрскай кавалерыйскай школы... Пазней у горадзе размяшчаўся польскі полк гродзенскіх уланаў. А ўжо з далучэннем Заходняй Беларусі да БССР Савецкага Саюза ў гэтых казармах знайшла сваё месца Пастаўская ваенная авіяцыйная школа пілотаў бамбардзіроўшчыкаў.

Паставы. Гандлёвыя рады. 1930-я гады.

Між іншым тут з 1940 года і да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны вучыўся будучы рускі дзіцячы пісьменнік Сяргей Аляксееў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ён вядомы сваімі адметнымі мастацка-публіцыстычнымі кнігамі — «Яны абаранялі Маскву», «Апошні штурм», «Сто апавяданняў пра вайну» і шмат яшчэ якіх кніг на тэмы гісторыі. Начальнікам Пастаўскай авіяшколы быў палкоўнік Вячаслаў Цімафееў. Пасля вайны ён напісаў кнігу «Таварышы лётчыкі», дзе расказаў і пра Паставы ў 1940—1941 гады.

...Увогуле Паставы — адно з найцікавейшых паселішчаў Віцебшчыны. Гісторыя горада даволі даўняя. Мы ж зазірнём у часіны больш блізкія да нас. Свой адметны след у гісторыі горада пакінулі славутыя Тызенгаўзы — Антоній (1733—1785) і Канстанцін (1786 — 1853). Менавіта Антоній, які займаў высокія гаспадарчыя пасады ў ВКЛ, зрабіў шмат для перабудовы Паставаў, для ператварэння паселішча ў сапраўдны прамысловы і культурны цэнтр Беларусі. Дапамагаў яму ў гэтым клопаце архітэктар Джузепа дэ Сака. Новая па тым часе планіроўка Рынкавай плошчы, будаўніцтва дома рамеснікаў, гарадской канцэлярыі і суда, школы, гатэля, аптэкі і рэалізацыя іншых архітэктурных праектаў — усё гэта і ёсць іх заслуга ў пераабсталяванні Паставаў. Пасля свой унёсак у развіццё горада зрабіў і Канстанцін Тызенгаўз. У яго палацы быў створаны арніталагічны музей. Адкрылася карцінная галерэя. Гаспадар выявіў сябе апантаным бібліяфілам, сабраўшы адзін з найлепшых кнігазбораў на Віцебшчыне.

Якія ж яшчэ славутыя імёны звязаны з Паставамі, пастаўскімі ваколіцамі?

У красавіку 1855 года ў Паставах нарадзіўся пісьменнік і журналіст Леў Давыдавіч Зэйдэль. Спярша закончыў яўрэйскую школу. Пасля — тэхнічнае чыгуначнае вучылішча ў Вільні. Настаўнікам нашага земляка быў «чайковец» Аляксееў (між іншым, хатні настаўнік дзяцей Льва Мікалаевіча Талстога). Сацыяльныя, палітычныя погляды Льва Зэйдэля сфарміраваліся пад уплывам знаёмства з творамі Мікалая Міхайлоўскага, Міхаіла Салтыкова-Шчадрына. Друкаваўся ўраджэнец Паставаў у часопісах «Восход», «Уральская жизнь», «Русская жизнь». Вядомыя кнігі Л. Зэйдэля — «Выходцы из черты оседлости» (Санкт-Пецярбург, 1910), «Железнодорожники» (Екацярынбург, 1910). Напісаў ён і п'есу «Ірад Вялікі». На жаль, болей звестак пра творчы і жыццёвы лёс Льва Зэйдэля адшукаць не ўдалося...

Паставы. Ашчадная каса. 1930-я гады.

У маёнтку Губіна на Пастаўшчыне нарадзіўся Антон Уладзіміравіч Станкевіч (1862 — 1919), расійскі і савецкі военачальнік. Імя яго, на вялікі жаль, згадваецца ў Беларусі не так і часта. У 1880 годзе Антон закончыў Віленскае пяхотнае вучылішча — вядомую кузню малодшых афіцэраў расійскай арміі. Прайшоў усе камандзірскія ступені. Першую Сусветную вайну пачаў камандзірам палка. Затым узначаліў брыгаду, потым дывізію. У 1917 годзе Антону Уладзіміравічу было прысвоена званне генерал-маёра. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Станкевіч пераходзіць на бок Савецкай улады. Камандаваў 42-й і 55-й стралковымі дывізіямі 13-й арміяй Паўднёвага фронту. У час Арлоўска-Кастрамской аперацыі 1919 года ў выніку здрады начальніка штаба 55-й дывізіі былога генерала Лаўрыца з групай чырвоных камандзіраў патрапіў у палон. Перайсці на бок белагвардзейцаў адмовіўся і быў павешаны. Пасмяротна Антона Уладзіміравіча Станкевіча ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга. Як герой Грамадзянскай вайны Антон Станкевіч пахаваны каля Крамлёўскай сцяны ў Маскве.

Пастаўскія Ліпнікі — радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Васіля Мікалаевіча Асяненкі (1916—1977). У час Вялікай Айчыннай вайны ён быў партызанскім разведчыкам, сакратаром Пастаўскага падпольнага райкама камсамола. Пасля вайны — на партыйнай рабоце. Узначальваў Глыбоцкі райкам КПБ. Званне Героя атрымаў у 1966 годзе за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці на Глыбоччыне.

Калі будзеце праходзіць па Паставах, то наўрад ці міняце вуліцу Маркава. Яна названа ў гонар Героя Савецкага Саюза Фёдара Рыгоравіча Маркава, які нарадзіўся ў вёсцы Качанішкі. Дарэчы, ёсць такая ж вуліца і ў Вілейцы, і ў Лынтупах. У маі 1942 года наш зямляк быў прызначаны камандзірам партызанскай брыгады імя Варашылава, адначасова ўзначальваў ваенна-аператыўны аддзел Вілейскага падпольнага абкама КП (б) Б. Званне Героя было прысвоена 1 студзеня 1944 года.

Цікавы лёс яшчэ ў адной удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны. Ганна Іванаўна Маслоўская нарадзілася ў вёсцы Курсевічы ў 1920 годзе. У 1942 годзе па заданні партызан у Паставах 15 сірот, бацькі якіх загінулі ад рук фашыстаў.

Лідзія Паўлаўна Абрамава — з пасляваенных дзяцей Пастаў. Калі закончыла сямігодку, паступіла ў Казанскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум. Шэсць гадоў адпрацавала на ваенным заводзе і, не пакідаючы працы, закончыла вакальнае аддзяленне Казанскага музычнага вучылішча. Следам паступіла ў Маскоўскі музычна-педагагічны інстытут імя Гнесіных. З 1978 года наша зямлячка — салістка Маскоўскай дзяржаўнай акадэмічнай філармоніі. У рэпертуары Лідзіі Паўлаўны звыш тысячы твораў, вялікія праграмы рускай і замежнай класікі, старадаўнія рамансы і народныя песні. Спявачка аб'ездзіла з канцэртамі не толькі ўсю Расію, але і многія краіны свету — гастралявала ў Венгрыі, Італіі, Англіі, Францыі, Мальце, Польшчы, Германіі і іншых куточках. Народная артыстка Расіі, яна доўгі час уваходзіла ў склад журы конкурса «Bella voce». Лідзія Паўлаўна — яшчэ і прэзідэнт Рэгіянальнага Грамадскага Фонду «Авэ Марыя».

Паставы. Палац Тызенгаўза. Пачатак XX стагоддзя.

У 1957 годзе ў Паставах нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Раеўскі (загінуў у 2008 годзе). Герой Расійскай Федэрацыі, заслужаны лётчык-выпрабавальнік Расіі, палкоўнік. Легендарная асоба, чалавек, вопыт якога як выпрабавальніка розных мадэляў самалётаў яшчэ надоўга застанецца ў арсенале авіяцыі Расіі і свету. У свой час Аляксандр служыў у палку карабельнай авіяцыі на авіяносцы «Мінск». Факт пра тое, што Раеўскі з 1990 да 1994 года здзейсніў 78 пасадак на палубу авіянясучага крэйсера «Адмірал Кузняцоў» (досыць часта — з надзвычайнай рызыкай для жыцця), і цяпер уражлівы прыклад майстэрства лётчыка-выпрабавальніка. А загінуў легендарны лётчык у аўтамабільнай катастрофе. Такое, на вялікі жаль, жыццё... Мне здаецца, што прыйдзе час — і нашаму земляку Аляксандру Міхайлавічу Раеўскаму абавязкова паставяць помнік на радзіме.

Часта бываючы ў Паставах, на Пастаўшчыне, не мінаю сустрэч з краязнаўцам Ігарам Пракаповічам. Вось і адноўчы пачуў ад яго такую думку: «Многія турыстычныя маршруты для школьнікаў нашай старонкі і для тых, хто прыязджае ў раён, горад, можна было б распрацаваць з улікам месцаў нараджэння славутых землякоў». Сапраўды, чаму б і не? Менавіта людзі, якія нечага дабіліся за свой кароткі век, упрыгожваюць гісторыю роднага краю. А Паставы, Пастаўшчына, акрамя згаданых славутых сыноў і дачок, — гэта яшчэ і лёсы паэтаў і пісьменнікаў: Уладзіміра Дубоўкі, Міхася Машары, Аркадзя Нафрановіча, ды і многіх дзеячаў беларускай культуры. А цяпер Ігар Пракаповіч завяршыў унікальную працу над гісторыяй броварскай справы на Пастаўшчыне і ў ваколіцах. Рукапіс яго працы — зусім новае ў айчыннай гісторыі, айчынным краязнаўстве. Вось бы знайсці зацікаўленага кнігавыдаўца для гэтага праекта!

Кастусь ЛЕШНІЦА.
Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Паставы. Рынак. Пачатак XX стагоддзя.

Паставы. Пачатак XX стагоддзя.

Паставы. Будынак афіцэрскай кавалерысцкай школы. Канец XIX стагоддзя.

З якімі навінамі «Мурава» сустракае Новы год

Напярэдадні зімовых свят нам давялося наведаць паспяховую гаспадарку Пружанскага раёна ААТ «Мурава», якая сёлета адзначыла свой 75-гадовы юбілей. Вакол неверагодная прыгажосць: бязмежныя палі, якія схаваліся пад пухнатым снегам, быццам набіраючыся сіл перад новым «гарачым» сезонам, і будынак канторы, які разам з прылеглай тэрыторыяй зайграў зусім новымі фарбамі з навагоднімі дэкарацыямі. Традыцыйна напрыканцы года прынята падводзіць вынікі. Асабліва гэта прыемна рабіць, калі ёсць пра што расказаць.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Паважаныя калегі,
віншуем вас з надыходзячымі Калядамі і Новым годам!

Ад усёй душы дзякуем за гэты выдатны прадукцыйны год. Сумеснымі намаганнямі мы дабіваемся выдатных вынікаў, упэўнены, што далей будзе толькі лепш. Жадаем вам у Новым годзе моцнага здароўя, шмат натхнення і творчых ідэй, міру, любові і дабрабыту ў вашых сем'ях.

Адміністрацыя гаспадаркі і прафсаюзны камітэт

Ужо добрай традыцыяй стала тое, што ААТ «Мурава» займае вядучае месца сярод вядучых гаспадарак краіны.

— Гэта вынік плённай працы ўсіх супрацоўнікаў гаспадаркі, — адзначае **дырэктар ААТ «Мурава» Пётр БІЛЕЦКІ.** — Такое дасягненне, безумоўна, павышае наш прэстыж і канкурэнтаздольнасць, а таксама вядзе да станоўчай дынамікі асноўных эканамічных паказчыкаў.

Напрыклад, рэалізацыя малака ў параўнанні з мінулым годам склала 112,6 %. Сярэдні надой малака ад адной каровы павялічыўся на 544 кг. Раслінаводства таксама вызначылася добрай статыстыкай. Так, вытворчасць цукровых буракоў да мінулага года склала 129,9 %, збожжавых і зернебабовых — 104,8 %. Парадавала і сярэднямесячная зарплата работнікаў гаспадаркі, якая за 2023 год узнялася больш чым на 500 рублёў.

Адметна, што адным з прынцыпаў работы ААТ «Мурава» з'яўляецца яе сацыяльная арыентаванасць.

— Кожны малады спецыяліст можа атрымаць службовае жыллё з магчымасцю выкупу пасля, — падкрэслівае **намеснік дырэктара Аляксандр МАРКЕЧКА.**

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Дружны калектыў ААТ «Мурава». Злева направа: дыспетчар Наталля МАРКЕЧКА, бухгалтары Ірына ЖУКОЎСКАЯ і Алена ДАНІЛЮК, спецыяліст па закупках Марына БЕЛІКАВА, бухгалтар Наталля ТАРАЗЕВІЧ, касір Святлана КУПРАКОВА.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Начальнік аддзела па сельскагаспадарчых машынах Аляксандр КАРУНАС разам з жонкай Крысцінай і дзецьмі Варварай, Жэняй і Кірылам.

Так, мы пабывалі ў гасцях **у начальніка аддзела па сельскагаспадарчых машынах Аляксандра КАРУНАСА.** Малады чалавек амаль дзевяць гадоў працуе ў гаспадарцы. Цяпер разам з жонкай Крысцінай і трыма дзецьмі ён жыве ў доме сядзібнага тыпу, прадастаўленага ААТ «Мурава». Старэйшая дачка Варвара ходзіць у другі клас Мураўскай сярэдняй школы, а хлопчыкі-блізняты ўвогуле яшчэ зусім малыя.

— Гаспадарка ўсё робіць для таго, каб маладыя спецыялісты тут затрымліваліся, — дзеліцца Аляксандр Карунас, — тут і перспектывы кар'ернага росту, і клопат аб работніках. Нядаўна вось нам газ у хату правялі. Гэта вельмі добрая навіна.

На дадзены момант у ААТ «Мурава» працуе больш за 30 маладых спецыялістаў ва ўзросце да 31 года. Усе ахвочыя забяспечаны жыллём. У распараджэнні ў гаспадаркі два інтэрнаты: мужчынскі і жаночы, а таксама шэраг дамоў сядзібнага тыпу.

Акрамя гэтага, ААТ «Мурава» нацэлена папаўняць свае рады маладымі кадрамі, таму сёлета было накіравана дзве заяўкі па мэтавым наборы ў Пружанскі аграрна-тэхнічны каледж.

А яшчэ гаспадарка заўжды імкнецца радаваць сваіх супрацоўнікаў падарункамі на розныя святы. Прычым спіс такіх добрых нагод досыць шырокі: ад дня працаўніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці да Новага года, дня Маці і дня Бацькі.

Ну што ж, цяпер, калі мы аддалі даніну традыцыі і падвялі асноўныя вынікі года, застаецца толькі пажадаць ААТ «Мурава» ў 2024 годзе яшчэ большага росквіту на ўсіх кірунках: як эканамічных, так і сацыяльных.

Лізавета ГОЛАД, Алена ДАЎЖАНОК.

УНП 100155376

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН»

16 января 2024 года проводит **366-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Арендодатель имущества	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы (руб.)	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Наименование и целевое использование имущества
65	**Учреждение «Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны», тел.: +37517 278-96-70, +37517 276-03-98**	г. Минск, пр-т Победителей, 8-1	94,2	3,0	398,00	Встроенное помещение под объект общественного питания (кафе). **Срок аренды – 3 года**
66		г. Минск, пр-т Победителей, 8-1	164,9	3,0	696,70	Под помещения для приготовления пищи. **Срок аренды – 3 года**
67	**Государственное учреждение «Университетская стоматологическая клиника», тел. +37517 379-57-59**	г. Минск, ул. Сухая, 28	3,0	3,0	12,68	Часть холла первого этажа под размещение кофейни самообслуживания. **Срок аренды – 3 года**
68	**УП «Жильё», тел. 8 (0177) 768532**	Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 4	14,0	3,0	59,15	Нежилое помещение для организации торговли непродовольственной группой товаров; оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр); офис; склад. **Срок аренды – 3 года**
69		Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 4	17,2	3,0	72,67	Нежилое помещение для организации торговли непродовольственной группой товаров; оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр); офис; склад. **Срок аренды – 3 года**
70		Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чаловской, 18-12	30,9	3,0	130,55	Часть изолированного нежилого помещения для организации торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров; оказание услуг (за исключением ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); офис; склад. **Срок аренды – 3 года**

Договор аренды заключается сроком **на пять лет**, если иное не указано в настоящей информации.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Аукцион состоится **16 января 2024 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 18 декабря 2023 г. по 10 января 2024 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 366 от 16.01.2024 по предмету аукциона № ___.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»), Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by** (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»).

Телефон для справок **+375 (17) 360 42 22.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Купала-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

Лот № 1: квартира с инв. № 630/D-47972 общей площадью 29,7 кв. м, адрес: Минская обл., г. п. Радошковичи, ул. Максима Горького, 23-3 (изолированное помещение, состоящее из 1-й жилой комнаты, кухни, коридора, кладовой; жилая пл. 16,8 кв. м).

Начальная цена – 315,40 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **31,00** бел. руб.

Лот № 2: квартира с инв. № 630/D-47973 общей площадью 29,4 кв. м, адрес: Минская обл., г. п. Радошковичи, ул. Максима Горького, 23-4 (назначение и наименование – квартира) (изолированное помещение, состоящее из 1-й жилой комнаты, кухни, коридора, кладовой; жилая пл. 16,6 кв. м).

Начальная цена – 312,27 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **31,00** бел. руб.

Квартиры расположены в многоквартирном жилом доме с инв. № 630/C-37331 (1970 г. п.).

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 623855700004000416 *(право постоянного пользования)*, площадь 0,1500 га. Участок расположен в водоохранной зоне реки Гуйка на площади 0,1500 га и в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0062 га.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **23.01.2024 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2024** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 136-31-11, 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (0176) 590-837, 500-130, 8 (029) 763-13-34, 8 (029) 193-68-96, 8 (029) 856-79-97.

УНП 600027831

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Супраць грыпу, COVID-19 і ротавіруснай інфекцыі

Якія вакцыны айчыннай распрацоўкі з'явяцца ў бліжэйшы час?

Беларускія навукоўцы сумесна з медыкамі актыўна працуюць над стварэннем уласных вакцын. Гэта і сучасная чатырохвалентная вакцына супраць грыпу, якая, акрамя іншага, будзе прыдатная для тых, хто мае супрацьпаказанні да прышчэпкі, а таксама вакцына супраць COVID-19 і шэраг РНК-вакцын, якія пры параўнанні з традыцыйнымі, інактываванымі, называюць «лічбавымі», бо яны маюць шэраг пераваг перад сваімі «аналагавымі» папярэдніка-мі. Навукоўцы расказалі пра свае распрацоўкі.

Без супрацьпаказанняў і алергій

Неаспрэчным з'яўляецца той факт, што вірусы былі пастаяннымі спадарожнікамі чалавецтва і перамагчы іх у бліжэйшай перспектыве наўрад ці ўдасца. Адзінае выйсце — быць гатовымі да сустрэчы з нябачным ворагам.

— Вірус SARS-COV-2, які выклікаў пандэмію каранавіруса, па факце аказаўся не самым смяротным. А вось давайце ўявім, што з'явіўся нейкі вірус умоўнай хваробы Х, якая закранула значна большую колькасць насельніцтва ва ўсім свеце і лятальнасць ад якой разы ў тры больш чым ад COVID, — наступствы на эканоміку і на развіццё краін могуць быць нашмат горшымі, чым ад нядаўняй пандэміі. Напрыклад, той жа банальны грып з узнікламі новым штамам, да якога ў насельніцтва планеты не будзе імунітэту, можа нанесці вельмі істотны ўрон. Успомнім пандэмію той жа «іспанкі», «свіны» грып, перыядычныя ўспышкі «птушынага» грыпу. Менавіта таму кожная краіна павінна распрацоўваць свае ўласныя сродкі — як для дыягностыкі, так і для прафілактыкі і лячэння вірусных інфекцый, — лічыць **дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі Андрэй ГАНЧАРОЎ.**

У той час, калі ў свеце з'явіліся першыя вакцыны супраць COVID-19, толькі дзве краіны — Расія і Кітай — на пачатковым этапе дапамаглі Беларусі. Усе іншыя выбралі спачатку забяспечыць уласныя патрэбы. У сувязі з гэтым у Беларусі актывізавалі даследаванні ў вобласці вірусалогіі і стварэння вакцын.

Таму з пачаткам пандэміі каранавіруса НАН Беларусі выступіла ініцыятарам распрацоўкі ўласнай вакцыны ад каранавіруснай інфекцыі і стварэнне новага цэнтра вірусалогіі.

— Новы цэнтр з'яўляецца сучаснай пляцоўкай для распрацоўкі вакцын. Гэта сістэма герметычных боксаў са шлюзамі з самымі сучаснымі на сённяшні дзень сістэмамі вентыляцыі і ачысткі сцёкавых вод. У нас маецца дазвол на працу з узбуджальнікамі першай — трэцяй груп рызыкі, — расказаў Андрэй Ганчароў.

Асноўная задача новага цэнтра вірусалогіі — распрацоўка сродкаў прафілактыкі і лячэння рэспіраторных інфекцый, якія выклікаюцца вірусамі. У прыватнасці, тут абяцаюць у наступным годзе выпусціць на рынак беларускую вакцыну супраць грыпу.

— Сёння вядзецца перш за ўсё распрацоўка нашай беларускай інактываванай вакцыны супраць грыпу. Яна чатырохвалентная, гэта значыць, будзе ўтрымліваць два штамы грыпу А і два штамы грыпу В. У адрозненне ад большасці прэпаратаў, якія зараз прымяняюцца, вірус будзем вырошчваць не на курыных эмбрыёнах, а на культурах клетак. Гэта прыбярэ адно з асноўных супрацьпаказанняў да вакцынацыі — алергію да бялку. Дадзеная распрацоўка будзе завершана ў наступным годзе, і я спадзяюся, што мы прыступім ужо да прамысловай вытворчасці, — кажа Андрэй Ганчароў.

Вядзецца ў інстытуце і шэраг іншых распрацовак, у прыватнасці, самых розных вакцын на аснове адэнавірусаў. А таксама прадпрымаюцца спробы атрымаць бялкі вірусаў з раслін.

— Самі трансгенныя расліны або раслінныя клеткі можна паспяхова мадыфікаваць такім чынам, каб яны сінтэзавалі для нас патрэбныя бялкі, якія будуць у далейшым выкарыстоўвацца ў якасці вакцын. Пакуль тая праца знаходзіцца на стадыі эксперымента. Але я спадзяюся, што мы тут таксама атрымаем нядрэнныя вынікі, бо ёсць шэраг пераваг падобнага метаду атрымання бялкоў у параўнанні з традыцыйнымі, — падзяліўся кіраўнік Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі.

Акрама стварэння вакцын у цэнтры вірусалогіі актыўна працуюць з ленцівірусными вектарамі. Гэта адмысловая сістэма дастаўкі генетычнай інфармацыі ў клетку, якая дапамагае мадыфікаваць клеткі і стымуляваць імунную сістэму. Мяркуецца, што гэта дапаможа ў барацьбе з ракам.

— Мы завяршылі работу над дэндрытнымі клеткамі, якія мадыфікаваны пры дапамозе ленцівірусных вектараў так, што добра экспрэсуюць анкаасацыяваныя пептыды. Такія дэндрытныя клеткі будуць неўзабаве выкарыстаны для лячэння анказахворванняў. Самі дэндрытныя клеткі, не мадыфікаваныя генетычна, мы выкарыстоўваем вельмі даўно і атрымліваем добры лячэбны эфект. А вось генетычна мадыфікаваныя клеткі, я спадзяюся, будуць мець шэраг пераваг і адпаведна клінічны эфект іх ужывання будзе вышэйшы, — дзеліцца Андрэй Ганчароў.

Распрацоўваюць навукоўцы і новыя прэпараты супраць грыпу. Яны будуць блакаваць увахо-джанне віруса ў клетку. Структура гэтых прэпаратаў разлічваецца на камп'ютары пры дапамозе спецыялізаванага праграмнага забеспячэння. Затым такія лекавыя сродкі будуць сінтэзаваны і апрабаваны. У выпадку іх высокай эфектыўнасці яны будуць запушчаны ў вытворчасць.

РНК-вакцыны без уколаў

Выраб вакцын — праца шматгранная. Стварэннем яе кампанентаў займаецца Інстытут мікрабіялогіі НАН Беларусі.

— Адна з работ, якія завяршаюцца ў нас сёлета, прысвечана стварэнню генна-інжынернага штаму мікраарганізма, які дазваляе прадукаваць РНК і ствараць так званыя РНК-вакцыны. Яе пераваг у тым, што зніжаюцца адмоўнае ўздзеянне, алергічныя праявы. Важным элементам з'яўляецца тое, што ўводзіцца такія вакцыны будуць не ўколамі, а ўнутраназальна, а гэта больш прывабна для пацыентаў, — расказвае **дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі Аляксандр ШЭПШЭЛЕЎ.**

Прычым вакцына, якую тут ствараюць, будзе не супраць пэўнага канкрэтнага захворвання. Яе ўніверсальная генетычная канструкцыя дазволіць уключаць у сістэму ДНК вызначаны вірус. І такім чынам з'явіцца магчымасць хутка атрымаць вакцыну актуальнага на дадзены момант віруснага захворвання.

— Мы арыентаваліся на вакцыну супраць COVID-19. Пакуль даклінічныя выпрабаванні, якія ўжо завяршаюцца, паказваюць дастаткова добрыя вынікі. На наступны год пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя плануем перайсці ўжо да стадыі клінічных выпрабаванняў, — падзяліўся Аляксандр Шэпшэлеў.

Варта адзначыць, створаная генетычная канструкцыя новай вакцыны дазволіць хутка мяняць яе састаў у залежнасці ад штамаў, якія цыркулююць.

Яшчэ адзін цікавы кірунак — распрацоўка генна-інжынерных мікраарганізмаў, якія дазволяць ствараць пэўныя бялкі.

— Мы ўзялі малочнакіслыя бактэрыі і на базе іх імкнёмся стварыць канструкцыю, якая дазваляла б прадукаваць не РНК-кампаненты, а непасрэдна мэтавыя бялкі, якія забяспечваюць выпрацоўку імунітэту. Гэта таксама ўніверсальная канструкцыя, якая дазваляе стварыць канкрэтны прэпарат пад актуальнае захворванне. У гэтым годзе мы правялі даклінічныя выпрабаванні, якія паказалі эфектыўнасць. У наступным годзе таксама выходзім на стадыю клінічных выпрабаванняў, — дадаў Аляксандр Шэпшэлеў.

Сумесна з РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі тут распрацоўваюць генетычную канструкцыю, якая дазваляе выпрацоўваць мэтавы бялок для барацьбы з ротавірусными інфекцыямі. Яе ўжо, дарэчы, удалося атрымаць, цяпер прэпарат вывучаецца і праходзіць апрабацыю ў клінічнай практыцы.

Чаму трэба быць асцярожнымі з мясам

Што такое «адутлаватка» і з чым яе ядуць?

Штогод з лістапада да лютага рэгіструюцца выпадкі захворвання людзей на трыхінелёз, і звязана гэта з паляваннем на дзікіх звяроў і масавым забоем хатняй жывёлы. Медыкі адзначаюць, што захворванне можа быць смяротна небяспечным для чалавека, часам яно становіцца прычынай інваліднасці і паралічаў.

Трыхінелёзам называюць інфекцыю, якую выклікаюць круглыя дробныя чарвякі. Гэта самыя небяспечныя паразіты, якія перадаюцца праз мяса. Для хваробы характэрныя ліхаманка, ацёк твару, міалгія (мышачны боль), сып на скуры. Пры цяжкім ходзе паталогіі часта пакутуюць унутраныя органы і ЦНС. Захворванне распаўсюджана ва ўсім свеце, акрамя краін, дзе не ўжываюць свініну. Яго пераносчыкі — усёедныя (асабліва свінні) і драпежныя жывёлы.

ЯК ПАРАЗІТ ТРАПЛЯЕ ДА ЧАЛАВЕКА?

— Трыхінелёз — гэта паразітарнае прыродна-ачаговае захворванне чалавека і некаторых жывёл, выкліканае біягельмінтамі сямейства трыхінел. Трыхінелы — дробныя жывародзячыя круглыя чарвякі, памерам ад 1 да 4 мм. У натуральных умовах цыркуляцыя трыхінел адбываецца з удзелам амаль 60 відаў хатніх і дзікіх млекакормячых, асабліва драпежных і ўсёедных. Паміж прыроднымі і сінантропнымі (жывёлы, якія жывуць сумесна з чалавекам) ачагамі адбываецца абмен інвазіяй. Занос трыхінелёзу з прыродных ачагоў у асяроддзе чалавека

адбываецца пераважна з тушкамі забітых дзікіх млекакормячых, пры паяданні якіх заражаюцца хатнія жывёлы і сінантропныя грызуны, — расказвае **ўрач-інфекцыяніст 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска Дар'я ПЕТРАЧУК.**

Крыніцай заражэння чалавека з'яўляецца мяса хатняй свінні, дзіка, барсука, белага і бурага мядзведзя і іншых.

Заражэнне адбываецца пры ўжыванні мяса, якое змяшчае інкапсуляваныя лічынкі трыхінел. Лічынкі трыхінел устойлівыя да варэння, вэнджання, салення, смажання і замарожвання. У працэсе стрававання капсулы раствараюцца, што займае прыкладна адну гадзіну. Юныя трыхінелы, знаходзячыся ў прасвеце кішэчніка, спеюць на працягу 3-4 сутак, пасля чаго самкі пачынаюць нараджаць лічынак. Працэс адраджэння доўжыцца ад 10 да 45 дзён, і пасля яго заканчэння дарослыя гельмінты хутка гінуць.

На гэтым кішэчная фаза завяршаецца і пачынаецца міграцыйная. Лічынкі пранікаюць у лімфатычныя шчыліны, па лімфатычных шляхах праз грудную пратоку трапляюць у ток крыві і разносяцца па ўсім арганізме. Міграцыя лічынак пачынаецца прыкладна на шосты дзень ад моманту заражэння.

Неўзабаве лічынкі асталёўваюцца ў папярэчнапаласатых мышцах, гэта апошняя, мышачная, фаза іх развіцця. Першыя, пакуль яшчэ нешматлікія лічынкі з`яўляюцца там ужо на 6-7 дзень. Яны размяркоўваюцца нераўнамерна, аддаючы перавагу мімічнай, дыхальнай, жавальнай мускулатуры, дыяфрагме, згінальнікам канечнасцяў. Асеўшы ў мышцах, лічынкі павялічваюцца ў памерах прыкладна ў дзесяць разоў і да 17-18 дня становяцца здольнымі заражаць наступнага гаспадара. Пры гэтым яны звіваюцца ў спіраль. Да 3-4 тыдня вакол лічынак фарміруюцца капсулы, у якіх тыя захоўваюць жыццядольнасць гадамі.

СІМПТОМЫ І ХОД ХВАРОБЫ

Інкубацыйны перыяд пры трыхінелёзе чалавека часцей працягваецца ад 10 да 25 дзён. Ужо з першых дзён хваробы адзначаецца дрэннае самаадчуванне, галаўны боль, павышэнне тэмпературы, часам да 39-40 °С. Візітная картка захворвання — ацёкі павекаў і твару, прычым пры цяжкім развіцці інфекцыі можа быць ацёк шыі. Менавіта па гэтай прычыне хваробу яшчэ называюць «адутлаватка». Неўзабаве ўзнікаюць мышачныя болі. Хворы на трыхінелёз не ўяўляе эпідэмічнай небяспекі, але падлягае шпіталізацыі, зыходзячы з неабходнасці своечасовага і рацыянальнага лячэння.

ЯК НЕ ЗАРАЗІЦЦА

Ёсць некалькі асноўных правіл прафілактыкі хваробы. Пры пакупцы мяса спажыўца выратуе толькі ўласная пільнасць.

➢ Па-першае, неабходна пазбягаць набыцця мяса і мясапрадуктаў (каўбасы, сала, закусачных шпікаў) па-за дзяржаўнымі пунктамі гандлю — на рынках, у выпадковых асоб з рук. Калі ж вы вырашылі купіць мясную прадукцыю на рынку, неабходна запытацца ў прадаўца пра даведку аб праведзенай ветэрынарнай экспертызе і бяспецы прадуктаў.

➢ Па-другое, важна правяраць у ветэрынарнай лабараторыі мяса свіней пры хатнім забоі, а таксама дзікіх жывёл, здабытых на паляванні.

➢ Паляўнічым забараняецца ўжываць або прадаваць мяса забітых усёедных драпежных жывёл без папярэдняй ветэрынарна-санітарнай экспертызы на наяўнасць лічынак трыхінел.

➢ Акрамя таго, нельга пакідаць у лесе тушкі звяроў пасля зняцця з іх скурак. Іх варта спальваць або закопваць на глыбіню не менш за два метры.

➢ Нельга скармліваць хатнім свіням ці сабакам мяса дзікіх жывёл без трыхінеласкапічнага даследавання. Пры станоўчых выніках гэтыя прадукты абавязкова трэба знішчыць.

➢ Каб папярэдзіць заражэнне трыхінелёзам хатніх свіней, варта забяспечыць непранікальнасць грызуноў у памяшканні, у якіх утрымліваюцца свінні, і своечасовую іх дэратызацыю, а таксама выключаць паяданне свіннямі трупаў грызуноў, загінулых жывёл, адходаў тушак дзікіх жывёл, здабытых на паляванні.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	ЗАО «Альфа-Банк», 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 43-47. УНП 101541947
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов – транспортные средства, бывшие в употреблении.
Местоположение: **г. Минск, ул. Красная, 7**

Лот № 1

Автомобили в количестве 6 единиц:
- два грузовых вагона: **Peugeot Boxer PRACTIK-PR 1622**, АМ 9771-7 (г. в. 2012) и **FORD TRANSIT PRAKTIK-PR1721**, р/зн. АХ 5640-7 (г. в. 2023);
- четыре грузопассажирских специальных вагона: три **Volkswagen TRANSPORTER PRAKTIK-PR 1910** - АР 2095-7 (г. в. 2017), АС 7438-7 (г. в. 2019), АС 7761-7 (г. в. 2019) и **Volkswagen TRANSPORTER PRAKTIK-PR 1920**, АС 4050-7 (г. в. 2019)

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 708 680,02 бел. руб.

Лот № 2

Автомобиль грузовой вагон **Volkswagen Caddy PRACTIK-19277,** АР 1561-7 (г. в. 2017)

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 43 520,00 бел. руб.

Лот № 3

Автомобиль грузовой вагон **Volkswagen Caddy PRACTIK-19277**, АС 3627-7 (г. в. 2019)

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 63 940,00 бел. руб.

Лот № 4

Автомобиль грузовой специальный вагон **Volkswagen TRANSPORTER ARCONA-184001-00**, АН 6482-7 (г. в. 2013)

Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 44 880,00 бел. руб.

Дополнительные условия: стоимость топлива, фактически находящегося в баках автомобиля на момент заключения договора купли продажи оплачивается отдельно

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by.** Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** по лоту № 1 и **6 %** по лотам №№ 2–4 от цены продажи лота

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.01.2024 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: по 22.01.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by

ОАО «Гомельоблреклама»
филиал «Эксперт-Услуга» **(организатор аукциона)**
по продаже имущества **ООО «АвтоЮла» (продавец)**
в лице антикризисного управляющего Потапченко Д.А.
извещает о проведении **5 января 2024 года открытого повторного аукциона со снижением на 10 %**
в 11.00 в городе Гомеле по ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.

Полуприцеп бортовой SCHWARZ MUELLER SPA 3/E.,
цвет – черный, кузов VAVJ203398H276760,
рег. № 6783АА-3, 2008 года выпуска.

Начальная цена без учета НДС (20 %) – 19 800,00 бел. руб.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 20.12.2023 по 03.01.2024 с 9.00 до 16.00.
Подробная информация на сайте – www.expert-usluga.by и www.bankrot.gov.by.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 01.11.2023 г. № 212 (30092). Тел. 8 (044) 599-18-16.

УНП 400071264

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Дата и место торгов – 05.01.2024 в 11.00, г. Минск, ул. Берута, д. 3Б, оф. 213.

Продавец – ООО «Растинторг», УНП 190823729.

Организатор торгов – ликвидатор Общества – ИП Рудяк Александр Олегович (тел. 8029-119-86-66).

Предмет торгов:

Лот 1. Посуда в количестве 248 позиций и компьютерная техника в количестве 3 позиций.

Начальная цена: Лот 1 – 32 899,38 руб.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены.

Размер задатка: 10 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на р/с – ООО «Растинторг», УНП 190823729: BY71BLBB30120190823729001001 в ОАО «Белинвестбанк», код банка BLBBBY2X до 04.01.2024.

Заявки на участие принимаются по адресу: 220092, г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 213 до 18.00 04.01.2024 г.

